**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

***ЗАЦВЯРДЖАЮ***
**Прарэктар па вучэбнай рабоце**
**Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**

**___________________ А. В. Данільчанка**
________27.06______ 2013 г.

Рэгістрацыйны № УД – __9264______/баз.

# ГІСТОРЫЯ РАСІІ І УКРАІНЫ

**Вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці**
**1-21 03 01 Гісторыя (па накірунках)**

Срок действия программы – до июня 2016 г.

Мінск 2013

**Складальнікі:**

**А. А. Яноўскі,** загадчык кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, прафесар

**В. І. Мянькоўскі,** прафесар кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар;

**Ю. А. Блашкоў,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**В. В. Брыгадзіна,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**В. А. Кахновіч,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук;

**С. Л. Лугаўцова,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**В. В. Сяргеенкава,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**С. М. Цемушаў,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

.

**Рэцэнзенты:**

**Э. А. Забродскі,** прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права філіяла Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай адукацыйнай установы вышэйшай пррафесійнай адукацыі "Расійскі дзяржаўны сацыяльны ўніверсітэт" у г. Мінску Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук

**Л. В. Мікалаева,** загадчык кафедры гуманітарных дысцiплін УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ:**

Кафедрай гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 15 ад 06 чэрвеня 2013 г.);

Саветам гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 10 ад 25 чэрвеня 2013 г.)

**Адказны за рэдакцыю:** *А. А. Яноўскі*

**Адказны за выпуск:** *В. В. Сяргеенкава*

# З М Е С Т


1. Тлумачальная запіска............................................................... 4

2. Прыкладны вучэбна-тэматычны план …………………......... 14

3. Змест вучэбнай дысцыпліны…………………..……………..... 20

4. Крыніцы і літаратура...........……………………………….…....... 54

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма новага пакалення па дысцыпліне «Гісторыя Расіі і Украіны» прызначана для яе засваення на першай ступені вышэйшай адукацыі студэнтамі, што навучаюцца па спецыяльнасці «Гісторыя» у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь. У ёй абноўлены змястоўны матэрыял, зроблены акцэнт на кампетэнтнасны падыход, значна пашыраны патрабаванні да самастойнай працы студэнта, прадугледжана выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У рамках узаемнага супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым «навігатарам» у засваенні ведаў, інфармацыі і набыцця практыкаарыентаваных уменняў.

Вучэбная праграма дысцыпліны «Гісторыя Расіі і Украіны» распрацавана ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі:

– “Адукацыйны стандарт Вышэйшай адукацыі. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1–21 03 01 Гісторыя (па накірунках)”. Зацверджаны і ўведзены ў дзейнасць пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08. 2013 г. № 88;

– Загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27.05. 2013 г. № 405 “Парадак распрацоўкі і зацвярджэння вучэбных праграм і праграм практыкі для рэалізацыі зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I ступені”;

– Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 29.05. 2012 г. № 53 “Аб зацвярджэнні правіл правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі”;

– Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 01.09. 2011 г. № 251 “Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку ажыццяўлення эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі”;

У адукацыйнай праграме ўлічаны патрабаванні “Адукацыйнага стандарту Вышэйшай адукацыі. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 03 01 Гісторыя (па накірунках)”.

## 1.1. Патрабаванні да кампетэнтнасці спецыяліста

Засваенне адукацыйнай праграмы павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый**, якія ўключаюць веды і ўменні па дысцыпліне, уменне вучыцца;

**сацыяльна-асабовых кампетэнцый**, якія ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веды ідэялагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы і ўменне трымацца іх;

прафесійных кампетэнцый, якія ўключаюць здольнасць рашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечываць іх выкананне ў абранай сферы прафесійнай дзейнасці.

**Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста.**

Спецыяліст павінен:

– умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;
– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
– валодаць даследчыцкімі навыкамі;
– умець працаваць самастойна;
– быць здольным выпрацоўваць новыя ідэі (крэатыўнасць);
– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;
– мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і работай з кампутарам;
– мець лінгвістычныя навыкі (вусная і пісьмовая камунікацыя);
– умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**Патрабаванні да сацыяльна-асабістых кампетэнцый спецыяліста.**

Спецыяліст павінен:

– валодаць якасцямі грамадзянскасці;
– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
– валодаць здольнасцямі да міжасобавых камунікацый;
– валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця;
– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне);
– умець працаваць у камандзе;
– быць здольным да самастойнага навучання;
– умець фарміраваць асабістыя высновы;
– быць здольным прымяняць атрыманыя веды.

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста.**

Спецыяліст павінен быць здольным:

***Выхаваўча-педагагічная дзейнасць:***

– планаваць, арганізоўваць і весці вучэбна-метадычную і навукова-метадычную работу;
– выкарыстоўваць аптымальныя формы і метады навучання;
– развіваць навыкі работы навучэнцаў з вучэбнай, навуковай і навукова-метадычнай літаратурай, гістарычнымі крыніцамі;
– арганізоўываць самастойную работу навучэнцаў;
– планаваць, арганізоўываць і весці выхаваўчую работу;
– фарміраваць у навучэнцаў навуковыя прадстаўленні аб грамадскіх падзеях, развіваць зацікаўленасць да вывучэння гісторыі;
– абагульняць і распаўсюджаваць перадавы вопыт арганізацыі выхаваўчай работы;
– фарміраваць грамадзянскую пазіцыю, патрыятызм, развіваць эстэтычныя прадстаўленні і высокія маральныя якасці асобы.

***Навукова-даследчыцкая дзейнасць:***

– фармуліраваць і рашаць задачы, якія ўзнікаюць у ходзе навукова-даследчыцкай і педагагічнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць неабходныя метады даследавання, мадыфіцыраваць існуючыя і ствараць новыя метады даследавання, зыходзячы з дакладных задач;

– арганізоўваць вучэбна-выхаваўчую работу на навуковай аснове, валодаць кампутарнымі метадамі пошуку, захоўвання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

***Арганізацыйна-упраўленчая дзейнасць:***

– планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць работу ў працоўных калектывах;

– разбірацца ў фінансавых пытаннях, грашовай і падаткавай палітыцы, разлічваць эфектыўнасць мерапрыемстваў і праектых рашэнняў, якія праводзяцца, з улікам кан’юктуры рынку;

– кантраляваць і падтрымліваць працоўную і вытворчую дысцыпліну;

– рыхтаваць даклады і аналітычныя матэрыялы;

– валодаць сучаснымі інфармацыйнымі рэсурсамі і сродкамі тэлекамунікацый.

***Аналітычная дзейнасць:***

– дыялектычна мысліць і аргументаваць сваю кропку зроку, аналізаваць факты і рабіць прагнозы развіцця падзей;

– аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага жыцця грамадства, тэндэнцыі яго ўстойлівага развіцця;

– рэдагаваць, рэферыраваць і рэцэнзаваць тэксты, рыхтаваць рукапісы да друку і ажыццяўляць аўтарскі кантроль за іх выданнем.

***Экспертна-кансультацыйная дзейнасць:***

– мець веды, практычны вопыт для кансультавання ў пытаннях вывучэння гісторыі, арганізацыі даследчыцкіх работ і выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі, навукі і культуры.

***Інавацыйная дзейнасць:***

– ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывах развіцця інавацыйных тэхналогій;

– вызначаць мэту інавацый і спосабы іх дасягнення;

– працаваць з навуковай, тэхнічнай і патэнтнай літаратурай;

– ацэньваць канкурэнтназдольнасць і эканамічную эфектыўнасць тэхналогій, якія распрацоўваюцца;

– прымяняць метады аналіза і арганізацыі ўкаранення інавацый;

– складаць дагаворы аб сумеснай дзейнасці па засваенню новых тэхналогій.

## 1.2. Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны

Курс «Гісторыя Расіі і Украіны» прызначаны для студэнтаў-гісторыкаў. Мэтай курса і ўдакладняючымі яе задачамі з’яўляюцца: выпрацоўка цэласнай сістэмы ведаў па гісторыі двух сумежных з Беларуссю дзяржаў; разгляд гісторыі двух сучасных сувярэнных краін у кантэксце сусветнага гістарычнага працэсу і ў цеснай сувязі з курсам айчыннай гісторыі, якая

вывучаецца паралельна; вызначэнне ў гісторыі Рассіі і Украіны найважнейшых перыядаў, падзей і фактаў, якія спрыялі ці перашкаджалі іх палітычнаму, эканамічнаму, сацыяльнаму і культурнаму развіццю; выяўленне ў гісторыі народаў-суседзяў падабенства і своеасаблівасці гістарычнага шляху, які яны прайшлі за IX–XXI стагоддзі.

Праграма дысцыпліны базіруецца на дэталёвай перыядызацыі, якая адлюстроўвае важнейшыя этапы ў гістарычным развіцці Расіі і Украіны. Прадугледжваецца вывучэнне адпаведных з'яў, падзей і фактаў на аснове выкарыстання шырокага кола гістарычных крыніц і навейшых дасягненняў гістарычнай навукі.

Праграма змацавана адзінай канцэпцыяй, прынцыпамі адбору і выкладання матэрыялу. Аўтары імкнуліся пазбягаць суб'ектыўных пунктаў гледжання, якія не замацаваліся ў сучаснай гістарычнай навуцы. Структура праграмы суадносіцца з прынцыпам гістарызму, вызначаецца адпаведнасцю гістарычнай рэчаіснасці. У аснову праграмнага матэрыялу пакладзена паслядоўная пазіцыя, якая зыходзіць з неабходнасці аб'ектыўнага вызначэння месца гісторыі Расіі і гісторыі Украіны ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай цывілізацыі, у кантэксце гісторыі Беларусі.

Праграма адлюстроўвае змест курса «Гісторыя Расіі і Украіны» і вызначае аб'ём ведаў, які патрабуецца ад студэнтаў-гісторыкаў. Пры яе распрацоўцы ўлічваўся вопыт чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У якасці вузлавых праблем, аналіз якіх запатрабаваны пры засваенні ўсяго курса, падзены: сацыяльна-эканамічнае развіццё, палітычны лад, унутраная і знешняя палітыка, сацыяльныя і палітычныя рухі, развіццё грамадскай думкі, культура, міжнацыянальныя і міжканфесіянальныя адносіны, агульнае і адметнае ў гісторыі двух народаў, роля аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, роля асобы і інтэлектуальнага асяроддзя. На аснове выкарыстання новых гістарычных крыніц і сучасных даследаванняў адлюстраваны важнейшыя праблемы шматвяковай гісторыі Расіі і Украіны, агульныя абставіны і тэндэнцыі іх гісторыі і дакладныя асаблівасці дзяржаўнага, грамадскага і культурнага развіцця.

Галоўнымі задачамі выкладання дысцыпліны «Гісторыя Расіі і Украіны» з'яўляюцца: фарміраванне і развіццё гістарычнага мыслення студэнта; раскрыццё агульных тэндэнцый і спецыфікі развіцця Расіі і Украіны са старажытных часоў да нашых дзён; зацвярджэнне прафесійных кампетэнцый гісторыка; садзейнічанне паглыбленню мэтаскіраванасці на практычнае ўвасабленне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і ў іншых сферах сацыяльнай актыўнасці для аналізу сучаснасці і прагназавання перспектыў будучага развіцця.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта да кампетэнцый выпускніка па дысцыпліне «Гісторыя Расіі і Украіны» выпускнік павінен:

**ведаць:**

– вызначальныя агульнаславянскія і ўсходнеславянскія складнікі ў гісторыі Расіі і Ўкраіны;

– асноўныя падзеі ўнутры- і знешнепалітычнай гісторыі ўсходнеславянскага рэгіёну, сувязі і тэндэнцыі іх прычын і наступстваў, асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця;

– змест этнакультурных працэсаў ва Усходняй Еўропе і змены ў рэлігійна-ідэялагічнай сферы;

– этапы, заканамернасці, асаблівасці развіцця расійскай дзяржаўнасці, характэрныя рысы абсалютызму;

– гістарычную прадумоўленасць фарміравання ўкраінскай дзяржаўнасці;

– сукупнасць фактаў, падзей, з'яў гісторыі Расіі і Украіны ў XVIII – пачатку XX ст.;

– агульныя заканамернасці і асаблівасці палітычнага і эканамічнага развіцця сацыяльнай структуры Расійскай імперыі;

– працэс фарміравання і характэрныя рысы асноўных накірункаў грамадскай думкі і культуры рускага і ўкраінскага народаў;

– асноўныя этапы гісторыі Савецкай дзяржавы, асаблівасці развіцця ў яе складзе Расіі і Украіны;

– важнейшыя факты і падзеі савецкай гісторыі, характарыстыкі яе галоўных дзеячоў;

– сутнасць і характар рэгіянальнай і знешней палітыкі сучаснай Расійскай Фэдэрацыі;

– тэндэнцыі і асаблівасці развіцця сучаснай Украіны;

– асноўны комплекс крыніц, сучасныя кропкі зроку даследчыкаў па важнейшых праблемах расійскай і ўкраінскай гісторыі.

***умець:***

– прымяняць атрыманыя веды для вырашэння дакладных педагагічных, метадычных, інфармацыйна-пошукавых, навуковых, інавацыйных і іншых задач;

– даказаць прыярытэтнасць агульнаславянскай і ўсходнеславянскай спадчыны ў гісторыі Расіі і Украіны;

– знаходзіць агульнае і асобнае ў развіцці ўсходнеславянскага рэгіёну на ўсіх этапах гісторыі;

– выяўляць і крытычна ацэньваць сутнасць асноўных з'яў і працэсаў гісторыі Расіі і Украіны;

– вызначаць і абгрунтоўваць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на сацыяльна-эканамічнае, этна-канфесійнае, дзяржаўна-палітычнае і культурнае развіццё рускага і ўкраінскга народаў;

– ажыццяўляць параўнальны аналіз мадэрнізацыйных працэсаў, характэрных для Расіі і Украіны ў перыяд, які вывучаецца;

– характарызаваць ролю і месца Расіі і Украіны ў рэгіянальным, цывілізацыйным і геапалітычным развіцці на ўсіх этапах гісторыі;

– аналізаваць крыніцы па гісторыі Расіі і Украіны і на іх аснове рабіць самастойныя навукова абгрунтаваныя высновы;

– даць самастойную і доказальную ацэнку навуковым работам і вучэбнай літаратуры па асноўных аспектах расійскай і ўкраінскай гісторыі.

***валодаць:***

– асноўным комплексам звестак па гісторыі Расіі і Украіны са старажытных часоў да сучаснасці;

– метадамі аналіза крыніц па гісторыі Расііі і Украіны са старажытных часоў да сучаснасці;

– ведамі ў вобласці гістарыяграфіі Расіі і Украіны са старажытных часоў да сучаснасці;

– практычнымі навыкамі выкарыстання ведаў па гісторыі Расіі і Украіны са старажытных часоў да сучаснасці ў прафесійнай дзейнасці;

– навыкамі і прыёмамі пошуку, накаплення і апрацоўкі гістарычнага матэрыялу па гісторыі Расіі і Украіны са старажытных часоў да сучаснасці.

Для дасягнення пазначанай вышэй мэты і рашэння задач патрэбна:

— сфарміраваць у студэнтаў уменне аналізаваць заканамернасці і асаблівасці дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, унутрыпалітычнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця Расіі і Украіны з улікам цывілізацыйных характарыстык і імкнуцца выхаваць на гэтай падставе асэнсаваную грамадзянскую пазіцыю і агульначалавечыя каштоўнасныя якасці;

— спрыяць засваенню студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей, створаных у працэсе гістарычнага развіцця Расіі і Украіны, і развіццю на гэтай аснове здольнасці да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі;

— спрыяць станаўленню здольнасці выпускніка вышэйшай школы ў сілу сваіх кампетэнцый, сфарміраваных у выніку свядомага засваення і прымянення вучэбнай гістарычнай інфармацыі, садзейнічаць далейшаму развіццю чалавечай супольнасці, міжнацыянальных і міждзяржаўных стасункаў, развіццю творчай і ініцыятыўнай асобы.

### 1.3. Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

У структуры зместу вучэбнай дысцыпліны вылучаюцца ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі (раздзел). Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае:

— Уводзіны;

— Раздзелы;

— Тэмы вучэбных заняткаў.

Па кожнаму вучэбнаму раздзелу (модулю) у адпаведнасці з мэтамі і задачамі па фарміраванню і развіццю ў студэнтаў прафесіянальных кампетэнцый выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя лекцыйныя і практычныя (семінарскія) заняткі. Змест вучэбнай праграмы па гісторыі Расіі і Украіны дазваляе вывучаць дысцыпліну і па праблемнаму, і

па храналагічнаму прынцыпах.

Кафедры вышэйшых навучальных устаноў, што ажыццяўляюць арганізацыю выкладання дадзенай дысцыпліны, расрацоўваюць рабочыя вучэбныя праграмы ў межах універсітэцкіх акадэмічных свабод. Рабочыя вучэбныя праграмы адлюстроўваюць спецыфіку прафесійнай арыентаванасці ВНУ, узровень і характар уласных навукова-метадычных пазіцый і вопыт навукова-даследчыцкай і педагагічнай дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага калектыву.

## 1.4. Метады (тэхналогіі) навучання

Па кожнаму вучэбнаму раздзелу у адпаведнасці з яго мэтай і задачамі па фарміраванню і развіццю ў студэнтаў прафесіянальных кампетэнцый выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца разнастайныя педагагічныя тэхналогіі. У ліку найбольш перспектыўных і эфектыўных сучасных інавацыйных адукацыйных сістэм і тэхналогій, што дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейсны падыход кампетэнтнасці ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, варта вылучыць: вучэбна-метадычныя комплексы; варыятыўныя мадэлі накіроўваемай самастойнай працы студэнтаў; блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы; інфармацыйныя тэхналогіі; методыкі актыўнага навучання.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, што спрыяюць актывізацыі пазнавальнай творчай дзейнасці студэнтаў, набыццю імі вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, варта вылучыць:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі модульна-рейтынгавага навучання;
– тэхналогіі рейтынгавага навучання;
– метад праектаў, ці праектныя тэхналогіі;
– техналогіі «Партфель студэнта»;
– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
– камунікатыўныя тэхналогіі (калоквіўмы, дыскусіі, круглыя сталы, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і інш.);
– гульнявыя тэхналогіі (арганізацыя і правядзенне дзелавых, ролевых, імітацыйных гульняў і інш.).

## 1.5. Кіруемая самастойная праца студэнтаў

Кампетэнтнасны падыход дапушчае істотнае ўзмацненне практычнай арыентаванасці адукацыйнага працэсу і ўзрастанне ролі кіруемай самастойнай працы студэнтаў у падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Кіруемая самастойная праца студэнтаў арганізуецца рэктаратамі, дэканатамі, кафедрамі, выкладчыкамі ВНУ ў адпаведнасці з Палажэннем аб самастойнай працы студэнтаў, распрацаваным вышэйшай навучальнай установай. Пры гэтым патрэбна кіравацца існуючымі нарматыўнымі дакументамі (Стандарт), а таксама накопленым вопытам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і іншых ВНУ Рэспублікі Беларусь (Гл.: Сергеенкова

В. В. Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы. – Мн., 2004; Лобанов А. П., Дроздова Н. В. Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий. – Мн., 2005; Педагогические основы самостоятельной работы студентов / Под ред. О. Л. Жук. – Мн., 2005).

Кіруемая самастойная праца студэнтаў прадугледжвае выкананне тэстаў, здачу прамежкавых залікаў, выкананне кантрольных прац, напісанне рэфератаў, азнаямленне з вучэбнай, вучэбна-метадычнай і навуковай літаратурай, працу з гістарычнымі крыніцамі, напісанне эсэ па праблемным тэмам, выкананне вучэбна-даследчыцкіх прац, стварэнне «партфоліо», стварэнне прэзентацый, электронных вучебна-метадычных комплексаў, правядзенне on-line калоквіўмаў і інш.

## 1.6. Дыягностыка сфарміраванасці кампетэнцый студэнта

Для атэстацыі навучэнцаў на адпаведнасць іх персанальным дасягненням ці дакладным патрабаванням адукацыйнай праграмы ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыпавыя заданні, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых работ і рэфератаў, метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы састаўлення эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый навучэнцаў і інш.

Дакладныя формы і працэдуры прамежкавага кантролю ведаў навучэнцаў па “Гісторыі Расіі і Украіны” распрацаваныя ў адпаведнасці з Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусі ад 29.05 2012 г. № 53 “Аб зацвярджэнні правіл правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу навучальных праграм вышэйшай адукацыі”.

Рэкамендуецца наступная працэдура:

— вызначэнне аб’ектаў дыягностыкі, якімі з’яўляюцца кампетэнцыі выпускніка;

— выяўленне фактычных вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;

— вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням навучальнага стандарта;

— ацэнка вынікаў выяўлення і вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта (з дапамогай шкалы ацэнак).

**Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:**

1. Вусная форма.
2. Пісьмовая форма.
3. Вусна-пісьмовая форма.
4. Тэхнічная форма.

**Да вуснай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:**
– субяседванне;
– кансультацыі;
– калоквіўмы;
– даклады на семінарскіх занятках;
–даклады на канферэнцыях;
– вусныя залікі;
– вусныя экзамены;
– ацэньванне на падставе "делавой гульні";
– тэсты дзеяння;
– дыскусіі;
– іншыя.

**Да пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:**
– тэсты;
– кантрольныя апросы;
– кантрольныя работы;
– пісьмовыя справаздачы па аўдыторных (хатніх) практычных заданнях;
– эсэ;
– анатацыі;
– пісьмовыя працы з крыніцамі;
– рэфераты;
– курсавыя работы;
– справаздачы па навукова-даследчыцкай рабоце;
– публікацыі артыкулаў, дакладаў;
– пісьмовыя залікі;
– пісьмовыя экзамены;
– стандартызаваныя тэсты;
– ацэнка па модульна-рэйтынгавай сістэме;
– ацэнка на аснове кейс-метада;
– ацэнка на аснове партфоліа;
– ацэнка на аснове праектнага метада;
– ацэнка на аснове "дзелавой гульні";
– іншыя.

**Да вусна-пісьмовай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:**
– справаздачы па аўдыторных практычных упражненнях з іх вуснай абаронай;
– справаздачы па хатніх практычных упражненнях з іх вуснай абаронай;
– курсавыя работы з іх вуснай абаронай;
– залікі;
– экзамены па дысцыпліне;
– абарона дыпломнай работы;
– ацэнка па модульна-рэйтынгавай сістэме;
– ацэнка на аснове праектнага метада;
– ацэнка на аснове "дзелавой гульні";
– іншыя.

**Да тэхнічнай формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:**

– электронныя тэсты;
– электронныя практыкумы;
– on-line калоквіўмы;
– прэзентацыі;
– іншыя.

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў на экзаменах па дысцыпліне ажыцяўляецца па дзесяцібальнай шкале.

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў, што выконваецца паэтапна па канкрэтных раздзелах (модулі) вучэбнай дысцыпліны, ажыцяўляецца кафедрай у адпаведнасці з выбранай ВНУ шкалой адзнак.

Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вывучэнне дысцыпліны "Гісторыя Расіі і Украіны" складае максімальна 658 гадзін, з іх 332 гадзіны аўдыторныя (236 гадзін – лекцыі, 96 гадзін – практычныя (семінары). Рэкамендуемыя формы кантролю ведаў студэнтаў – экзамены і залікі.

## 2. ПРЫКЛАДНЫ ВУЧЭБНА-ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| **Раздзел I. Расія і Украіна са старажытных часоў да пачатку XVII ст.** | | | | |
| I.1. | Уводзіны. | 2 | 2 | - |
| I.2. | Дадзяржаўны перыяд гісторыі ўсходніх славян. | 2 | 4 | - |
| I.3. | Старажытная Русь (канец IX — пачатак XII ст.). | 6 | 4 | 2 |
| I.4. | Палітычная раздробленнасць Русі: Галіцкае і Валынскае княствы, Растова-Суздальская зямля, Наўгародская рэспубліка і інш. | 4 | 4 | 2 |
| I.5. | Культура Русі ў IX — пачатку XII ст. | 4 | 2 | - |
| I.6. | Барацьба народаў Русі з агрэсіяй крыжакоў і манголаў. | 6 | 4 | 2 |
| I.7. | Паўночна-Усходняя Русь у XIV — першай палове XV ст. | 6 | 4 | 2 |
| I.8. | Ноўгарад і Пскоў у XIV — першай палове XV ст. | 4 | 2 | - |
| I.9. | Культура ўсходнеславянскіх народаў у XIII — першай палове XV ст. | 4 | 2 | - |
| I.10 | Утварэнне Расійскай дзяржавы (Расіі) на рубяжы XV—XVI стст. | 4 | 4 | 2 |
| I.11 | Украінскія землі ў XIV — першай палове XVI ст. | 4 | 2 | 2 |
| I.12 | Расія ў XVI ст. | 4 | 4 | 2 |
| I.13 | Культура Расіі ў канцы XV — XVI ст. | 4 | 2 | - |
| I.14 | Расія ў канцы XVI — пачатку XVII ст. | 6 | 4 | 2 |
| I.15 | Украіна ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI — першая палова XVII ст.) | 4 | 2 | 2 |
| I.16 | Нацыянальна-культурны ўздым ва Украіне (другая палова XVI — першая палова XVII ст.). | 4 | 2 | 2 |
| | **Усяго** | **68** | **48** | **20** |

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| **Раздзел II. Расія і Украіна ў XVII—XVIII стст.** | | | | |
| II.1. | Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі ў XVII ст. | 6 | 4 | 2 |
| II.2. | Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Расіі ў XVII ст. | 2 | 2 | - |
| II.3. | Вызваленчая вайна ўкраінскага народа. Палітычныя стасункі Левабярэжнай Украіны з Расійскай дзяржавай. | 4 | 2 | 2 |
| II.4. | Культура Расіі ў XVII ст. | 2 | - | 2 |
| II.5. | Унутрыпалітычнае становішча Расіі ў канцы XVII ст. Рэформы першай чвэрці XVIII ст. | 4 | 2 | 2 |
| II.6. | Знешняя палітыка Расіі (канец XVII — першая чвэрць XVIII ст.). | 2 | 2 | - |
| II.7. | Культура Расіі на рубяжы XVII—XVIII стст. | 2 | 2 | - |
| II.8. | Унутраная і знешняя палітыка Расіі пры пераймальніках Пятра I (1725—1762 гг.). | 4 | 4 | - |
| II.9. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Расіі ў другой палове XVIII ст. | 2 | 2 | - |
| II.10 | Час Кацярыны II і Паўла I: унутраная палітыка ва ўмовах узмацнення сацыяльнага супрацьстаяння. | 4 | 4 | - |
| II.11 | Знешняя палітыка Расіі ў другой палове XVIII ст. | 4 | 2 | 2 |
| II.12 | Культура Расіі ў сярэдзіне і другой палове XVIII ст. | 2 | 2 | - |
| II.13 | Левабярэжная Украіна ў канцы XVII — XVIII ст. | 4 | 2 | 2 |
| II.14 | Слабадская Украіна ў XVII—XVIII стст. | 2 | 2 | - |
| II.15 | Запарожская Сеч у другой палове XVII — XVIII ст. | 2 | 2 | - |
| II.16 | Правабярэжная Украіна ў канцы XVII — XVIII ст. | 2 | 2 | - |
| II.17 | Заходнеўкраінскія землі ў другой палове XVII — XVIII ст. | 2 | 2 | - |
| II.18 | Культура ўкраінскіх зямель у другой палове XVII — XVIII ст. | 2 | - | 2 |
| | **Усяго** | **52** | **38** | **14** |

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| **Раздзел III. Расія і Украіна ў першай палове XIX ст.** | | | | |
| III.1 | Адміністрацыйна-палітычная сістэма і сацыяльна-эканамічнае развіццё Расіі ў першай палове XIX ст. | 2 | 2 | - |
| III.2 | Унутраная палітыка самадзяржаўя ў першай чвэрці XIX ст. | 6 | 4 | 2 |
| III.3 | Знешняя палітыка Расіі ў першай чвэрці XIX ст. | 6 | 4 | 2 |
| III.4 | Унутраная палітыка царскага ўрада ў другой чвэрці XIX ст. | 6 | 4 | 2 |
| III.5 | Знешняя палітыка Расіі ў другой чвэрці XIX ст. | 2 | 2 | - |
| III.6 | Грамадскі рух і масавая барацьба ў першай чвэрці XIX ст. | 8 | 4 | 4 |
| III.7 | Грамадскі рух і масавая барацьба ў другой чвэрці XIX ст. | 8 | 4 | 4 |
| III.8 | Украінскія землі ў складзе Расійскай імперыі у першай палове XIX ст. | 2 | 2 | - |
| III.9 | Заходнеўкраінскія землі ў складзе Аўстрыйскай манархіі ў першай палове XIX ст. | 2 | 2 | - |
| III.10 | Культура Расіі ў першай палове XIX ст. | 4 | 4 | - |
| III.11 | Культура Украіны ў першай палове XIX ст. | 2 | 2 | - |
| | **Усяго** | **48** | **34** | **14** |
| **Раздзел IV. Расія і Украіна ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** | | | | |
| IV.1. | Адмена прыгоннага права ў Расіі. Унутраная палітыка самадзяржаўя ў 1860—1870-х гг. | 6 | 4 | 2 |
| IV.2. | Унутраная палітыка расійскага ўрада ў 1881—1894 гг. | 2 | 2 | |
| IV.3. | Сацыяльна-эканамічнае развіццё Расіі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. | 2 | 2 | - |
| IV.4. | Знешняя палітыка Расіі ў другой палове XIX ст. | 2 | 2 | - |

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| IV.5. | Грамадска-палітычны рух у 1860—1890-я гг. | 6 | 4 | 2 |
| IV.6. | Расійскае самадзяржаўе ў 1894—1904 гг. | 2 | 2 | - |
| IV.7. | Знешняя палітыка Расіі ў пачатку XX ст. | 2 | 2 | - |
| IV.8. | Грамадска-палітычная барацьба ў Расіі на рубяжы XIX—XX стст. | 2 | 2 | - |
| IV.9. | Рэвалюцыя 1905—1907 гг. у Расіі. | 4 | 2 | 2 |
| IV.10 | Унутраная палітыка расійскага ўрада і грамадска-палітычны рух у 1907—1914 гг. | 2 | 2 | - |
| IV.11 | Удзел Расіі ў Першай сусветнай вайне. | 4 | 2 | 2 |
| IV.12 | Унутрыпалітычнае становішча Расіі ў 1914—1917 гг. | 4 | 2 | 2 |
| IV.13 | Украінскія землі ў складзе Расійскай імперыі у другой палове XIX — пачатку XX ст. | 2 | 2 | - |
| IV.14 | Заходнеўкраінскія землі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. | 2 | 2 | - |
| IV.15 | Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. | 2 | 2 | - |
| IV.16 | Культура Расіі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. | 2 | - | 2 |
| IV.17 | Украінская культура ў другой палове XIX — пачатку XX ст. | 2 | - | 2 |
| | **Усяго** | **48** | **34** | **14** |
| **Раздзел V. Расія і Украіна ў 1917—1939 гг.** | | | | |
| V.1. | Расстаноўка сацыяльных і палітычных сіл у Расіі і Украіне пасля Лютаўскай рэвалюцыі. | 4 | 2 | 2 |
| V.2. | Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне ў Петраградзе. | 4 | 2 | 2 |
| V.3. | Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні (кастрычнік 1917 г. — 1920 г.). | 2 | 2 | - |
| V.4. | Расія і Украіна ў гады Грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі (1918—1922 гг.). | 4 | 4 | - |

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| V.5. | Пераход ад «ваеннага камунізму» да новай эканамічнай палітыкі | 2 | 2 | - |
| V.6. | Утварэнне СССР | 4 | 2 | 2 |
| V.7. | Расія і Украіна ў гады нэпа | 4 | 2 | 2 |
| V.8. | Выбар стратэгіі фарсіраванай індустрыялізацыі | 4 | 2 | 2 |
| V.9. | Суцэльная калектывізацыя | 4 | 2 | 2 |
| V.10 | Супярэчлівасць сацыяльна-эканамічнага развіцця Расіі і Украіны | 4 | 2 | 2 |
| V.11 | Палітычная сістэма грамадства | 4 | 4 | - |
| V.12 | Культурная рэвалюцыя | 4 | 2 | - |
| V.13 | Знешняя палітыка СССР у 1920-х — 1930-х гг | 4 | 2 | 2 |
| | **Усяго** | **48** | **30** | **16** |
| **Раздзел VI. Расія і Украіна з 1939 г. да сучаснасці.** | | | | |
| VI.1 | Эканамічны і ваенны патэнцыял Савецкага Саюза напярэдадні Другой сусветнай вайны. | 6 | 4 | 2 |
| VI.2 | Уступленне СССР у Другую сусветную вайну. | 6 | 4 | 2 |
| VI.3 | Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. | 6 | 4 | 2 |
| VI.4 | Нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Расіі і Украіны. | 6 | 2 | 4 |
| VI.5 | Карэнны пералом у ходзе Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны | 6 | 4 | 2 |
| VI.6 | Разгром фашысцкага блока ў 1944—1945 гг. | 6 | 4 | 2 |
| VI.7 | Расія і Украіна у першым пасляваенным дзесяцігоддзі | 6 | 4 | 2 |
| VI.8 | Расія і Украіна ва ўмовах палітычнай і эканамічнай лібералізацыі сярэдзіны 1950-х — пачатку 1960-х гг. | 6 | 4 | 2 |
| VI.9 | Расія і Украіна ў перыяд абвастрэння крызіса савецкай сістэмы сярэдзіны 1960-х — пачатку 1980-х гг. | 6 | 4 | 2 |

| №<br>п/п | Назвы раздзелаў<br>і тэм | Колькасць аўдыторных<br>гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семінары |
| VI.10 | Расія і Украіна на этапе перабудовы | 6 | 4 | 2 |
| VI.11 | Расійская Федэрацыя на сучасным этапе | 4 | 2 | 2 |
| VI.12 | Украіна на сучасным этапе | 4 | 2 | 2 |
| | **Усяго** | **68** | **42** | **26** |
| | **Усяго па дысцыпліне** | **332** | **236** | **96** |

## 3. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### *РАЗДЗЕЛ І.* РАСІЯ І УКРАІНА СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА ПАЧАТКУ XVII ст.

**І.1. Уводзіны.** Задачы і праблемы курса. Усходнеславянскі этнас у сусветнай гісторыі, яго месца ў гістарычным лёсе Беларусі.

Крыніцы гісторыі ўсходніх славян і метады работы з імі пры вывучэнні курса. Гістарыяграфія вузлавых пытанняў гісторыі ўсходніх славян. Праблемы перыядызацыі.

**І.2. Дадзяржаўны перыяд гісторыі ўсходніх славян.** Пытанне пра паходжанне славян. Рассяленне славян ва Усходняй Еўропе. Усходнеславянскія саюзы плямён. Племянныя княжанні.

Гаспадарка, культура і вераванні ўсходніх славян. Гандлёвыя шляхі Усходняй Еўропы. Распад радавых адносін. Каланізацыйны наступ. Узаемаадносіны з суседзямі.

**І.3. Старажытная Русь (канец IX — пачатак XII ст.).** Перадумовы ўтварэння дзяржаўнасці ўсходніх славян. Першыя пераддзяржаўныя ўтварэнні: “Паўночная канфедэрацыя плямён”, “Рускі каганат”. Аб’яднанне ўсходнеславянскіх саюзаў плямён пад уладай кіеўскіх князёў. Варажскі ўплыў. Пытанне пра паходжанне назвы «Русь». Сведчанні крыніц пра пачатковую гісторыю Русі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Земляробства, жывёлагадоўля, промыслы. Грамадскія адносіны. Верв. Маёмаснае і сацыяльнае размежаванне. Вёска і горад. Рамяство, гандаль.

Палітычны лад. Рэформы Вольгі, Уладзіміра Святаславіча, Яраслава Мудрага і Уладзіміра Манамаха. Умацаванне княжацкай улады. Тэстамент Яраслава Мудрага. Прынцып спадкаемства кіеўскага прастола. Увядзенне хрысціянства. Фарміраванне заканадаўства. Руская Праўда. Сацыяльныя рухі.

Знешняя палітыка кіеўскіх князёў. Міжнародныя сувязі Русі. Адносіны з Візантыяй. Разгром Хазарыі. Процістаянне Кіева, Ноўгарада і Полацка. Дынастычныя шлюбы. Русь і Заходняя Еўропа. Барацьба з печанегамі і полаўцамі. Русь і краіны Усхода.

**І.4. Палітычная раздробленасць Русі.** Перадумовы і прычыны палітычнай раздробленасці. Дзяржаўны лад старажытнарускіх княстваў. Падаткава-данніцкая сістэма.

Кіеўская зямля. Стан гаспадаркі. Міграцыя насельніцтва. Баярскія вотчыны. Усобіцы з-за кіеўскага стала. Сістэма двуўмвірата. Чорныя клабукі. Арганізацыя барацьбы з полаўцамі.

Галіцкая і Валынская землі. Сельская гаспадарка, промыслы, гандаль, рамяство. Баярства і гараджане. Валадаранне Яраслава Асмамысла і Рамана Мсціславіча. Аб’яднанне Галіцкага і Валынскага княстваў. Міжусобныя вой-

ны. Барацьба з Венгрыяй і Польшчай. Унутраная і знешняя палітыка Данілы Раманавіча, яго каранацыя. Галічына і Валынь пры нашчадках Данілы.

Паўночна-Усходняя Русь. Растова-Суздальская зямля. Развіццё гаспадаркі. Каланізацыя зямель. Гарады. Палітыка Юрыя Даўгарукага. Узвышэнне Уладзіміра-на-Клязьме. Андрэй Багалюбскі. Усевалад Вялікае Гняздо. Барацьба княжацкай улады з баярствам. Міжусобныя войны. Ліпіцкая бітва.

Наўгародская зямля. Земляробства, рамяство, промыслы. Знешні гандаль. Баярскія сядзібы. Сацыяльныя адносіны. Утварэнне Наўгародскай феадальнай (баярскай) рэспублікі, яе палітычны лад. Роля веча. Княжацкая ўлада ў Ноўгарадзе.

Агульнае і асаблівае ў развіцці іншых старажытнарускіх княстваў, асноўныя вехі іх палітычнай гісторыі.

**І.5. Культура Русі ў IX — пачатку XIII ст.** Характар і асаблівасці развіцця культуры. Роля культурных кантактаў з іншымі народамі. Антычная спадчына.

Культура матэрыяльнай вытворчасці. Горад Русі. Майстэрства рамеснікаў.

Вусная народная творчасць. Пісьменнасць, берасцяныя граматы. Літаратура і яе жанры. Пачатак летапісання. «Слова пра паход Ігаравы». Гісторыя Русі ў «Аповесці мінулых гадоў».

Дойлідства і жывапіс. Мураванае дойлідства. Кніжная мініяцюра. Іканапіс. Фрэска. Мазаіка.

Культурнае ўзаемадзеянне паміж землямі Русі. Падабенства і мясцовыя асаблівасці мовы і культуры. Росквіт культуры ў канцы XII — пачатку XIII ст. Помнікі культуры Ноўгарада і Уладзіміра-Суздальскага княства.

Культура старажытнай Русі як частка сусветнай культуры.

**І.6. Барацьба народаў Русі з агрэсіяй крыжакоў і манголаў.** Агрэсія крыжакоў у Прыбалтыцы. Роля папскай курыі. Ордэн мечаносцаў і Тэўтонскі ордэн, іх аб'яднанне. Наступ нямецкіх рыцараў і шведскіх феадалаў на Ноўгарад і Пскоў. Неўская бітва. «Лядовае пабоішча». Аляксандр Неўскі.

Уварванне манголаў у паўднёварускія стэпы. Бітва на Калцы. Паходы Батыя. Барацьба народаў Русі супраць заваёўнікаў. Устанаўленне ардынскага засілля. Наступствы мангольскага нашэсця на Русь.

Паўночна-Усходняя Русь у другой палове XIII ст. Утварэнне Залатой Арды. Фарміраванне ардынскай адміністрацыі. Баскакі. Ярлыкі. Княжанне ва Уладзіміры Аляксандра Неўскага. Перапіс ардынцамі рускага насельніцтва. Антыардынскія паўстанні гарадоў. Паўночна-Усходняя Русь пры пераемніках Аляксандра. "Дзюдзенева раць".

**І.7. Паўночна-Усходняя Русь у XIV — першай палове XV ст.** Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Умовы аднаўлення вытворчых сіл. Развіццё земляробства. Рост свецкага і царкоўнага землеўладання. Гаспадарка феадальнай вотчыны. Формы эксплуатацыі і асабістай залежнасці сялянства. Стан рамяства. Гандаль.

Палітычны лад. Палітычная сістэма Вялікага княжання Уладзімірскага. Царква, яе месца ў грамадстве і роля ў палітычнай сістэме. Сістэма "гаспадарскага Двара". Узаемаадносіны з Залатой Ардой.

Нарастанне аб'яднальных тэндэнцый. Узнікненне Маскоўскага княства. Узмацненне эканамічнага і палітычнага становішча Маскоўскага і Цвярскога княстваў у першай чвэрці XIV ст. Паўстанне 1327 г. у Цверы. Барацьба за ярлык на вялікае княжанне. Іван Каліта. Куплі Івана Каліты.

Новы этап барацьбы за палітычнае вяршэнства на Русі. Разгортванне барацьбы за звяржэнне ардынскага засілля. Дзмітрый Данскі. Кулікоўская бітва. Нашэсці Тахтамыша і Едыгея. Адносіны з Вялікім Княствам Літоўскім. Паходы Альгерда на Маскву. Адносіны Масквы і Вільні падчас княжання вялікага князя літоўскага Вітаўта.

Феадальная (дынастычная) вайна ў другой чвэрці XV ст. Прычыны і асноўныя этапы вайны. Вынікі вайны і яе значэнне.

**I.8. Ноўгарад і Пскоў у XIV — першай палове XV ст.** Развіццё сацыяльна-эканамічных адносін у Вялікім Ноўгарадзе, яго палітычнае жыццё. Утварэнне Пскоўскай феадальнай рэспублікі, яе сацыяльна-эканамічны і палітычны лад. Барацьба Ноўгарада і Пскова з агрэсіяй нямецкіх феадалаў. Міжнародныя сувязі. Узаемаадносіны з Паўночна-Усходняю Руссю.

**I.9. Культура ўсходнеславянскіх народаў у XIII — першай палове XV ст.** Асноўныя фактары культурнага развіцця. Роля Царквы ў развіцці культуры. Адлюстраванне ў культуры палітычнага жыцця.

Летапісныя зводы. Літаратура. Кулікоўскі цыкл: «Задоншчына», «Сказанне аб Мамаевым пабоішчы» і інш. Воінская аповесць. Епіфаній Прамудры. «Хаджэнне» Афанасія Нікіціна.

Дойлідства. Жывапіс. Феафан Грэк, Андрэй Рублёў, Дзіянісій і іх мастацкія школы.

Міжнародныя сувязі ў галіне культуры. Культурны ўплыў Вялікага Княства Літоўскага.

Украінская культура, яе здабыткі і асаблівасці. Асвета і навука. Школа і калегіўмы. Навуковыя цэнтры. Астрожская акадэмія. Архітэктура і скульптура. Іканапіс кіеўскіх сабораў. Літаратура і паэзія.

Узмацненне мясцовых рысаў у культуры ўсходнеславянскіх народаў.

**I.10. Утварэнне Расійскай дзяржавы (Расіі) на рубяжы XV—XVI стст.** Сацыяльна-эканамічныя, унутры- і знешнепалітычныя ўмовы ўтварэння і развіцця Расійскай дзяржавы.

Звяржэнне ардынскага засілля. Далучэнне да Маскоўскага Вялікага княства Ноўгарада, Цверы, Пскова, Разані, Смаленска і Чарнігава-Северскай зямлі.

Дзяржаўна-палітычны лад Расіі. Узмацненне ўлады маскоўскіх вялікіх князёў. Асаблівасці стварэння адзінай Рассійскай дзяржавы.

Праўленні Івана III і Васіля III. Баярская дума. Зараджэнне прыказнага кіравання. Агульнарасійскі Судзебнік. Мясцовае кіраванне. Арганізацыя

войска. Княжацка-баярская апазіцыя. Пытанне аб пераходзе прастола ў спадчыну. Царква і велікакняжацкая ўлада. Ерэтычныя рухі.

Міжнароднае становішча Расійскай дзяржавы. Знешнепалітычная дактрына Расіі, яе абгрунтаванне і пачатак рэалізацыі на захаднім і ўсходнім накірунках. Эканамічныя сувязі Расіі з іншымі краінамі (Вялікае Княства Літоўскае, Польшча, Крымскае ханства, Свяшчэнная Рымская імперыя і інш.).

**І.11. Украінскія землі ў XIV — першай палове XVI ст.** Страта дзяржаўнасці. Польшча ў барацьбе за перадзел галіцка-валынскай спадчыны. Уключэнне Паўднёвай Русі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Узмацненне барацьбы паміж Вільняй і Масквой за «збіранне рускіх зямель». Лёс Закарпацця і Паўночнай Букавіны. Пачатак экспансіі Крымскага ханства і Турцыі.

Гаспадарчае жыццё і сацыяльная стратыфікацыя. Пачатак распаўсюджвання фальварачна-паншчыннай гаспадаркі. Гарады. Магдэбургскае права. Развіццё рамяства і гандлю.

Эвалюцыя палітычнага ладу і развіццё права ў Вялікім Княстве Літоўскім. Канфесійнае пытанне.

Наступ прыгонніцтва і сялянскі рух. Паўстанне пад кіраўніцтвам Мухі. Удзел закарпацкіх русінаў у паўстанні Дз. Дожы.

Пачатак фарміравання казацтва. П. Лянцкаронскі, Я. Дашкевіч, Д. Вішнявецкі. Утварэнне Запарожскай Сечы.

**І.12. Расія ў XVI ст.** Тэрыторыя і насельніцтва. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Феадальнае землеўладанне і ўзмацненне прыгнёту сялянства. Горад. Рамяство і гандаль.

Барацьба баярскіх груповак за ўладу. Губная і грашовая рэформы Алены Глінскай. Абвастрэнне сацыяльных адносін. Самадзяржаўе Івана IV. Царскі тытул. Пачатак дзейнасці земскіх сабораў. «Выбраная рада». Судзебнік 1550 г. «Стоглаў». Царква і дзяржава. Рэформа мясцовага самакіравання. Вайсковыя рэформы. Узвядзенне засечнай мяжы і арганізацыя пагранічнай службы. М. Варатынскі.

Сацыяльна-эканамічныя прычыны і вынікі апрычніны. Апрычны тэрор.

Знешняя палітыка Расіі ў першай палове XVI ст.: усходні і заходні накірункі. Казанскія паходы і далучэнне Паволжа. Астраханскае ханства. Лівонская вайна. Этапы Лівонскай вайны, яе вынікі. Пачатак заваявання Сібіры. Строганавы. Ярмак. Вынікі знешняй палітыкі Расіі.

**І.13. Культура Расіі ў канцы XV — XVI ст.** Матэрыяльная культура. Народная творчасць. Палемічная літаратура. Складванне дзяржаўнай ідэалогіі і адлюстраванне яе ў афіцыйнай літаратуры. Публіцыстычныя творы Максіма Грэка, Івана Перасветава, Ермалая-Эразма, Андрэя Курбскага, Івана IV.

Узмацненне ідэалагічнага ўплыву царквы. Мітрапаліт Макарый. «Дамастрой». Царква і адукацыя.

Росквіт і спыненне агульнадзяржаўнага летапісання. Хранографы. Пачатак кнігадрукавання. Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец. Першыя друкаваныя кнігі.

Навуковыя веды і іх рэалізацыя на практыцы. Элементы рацыяналізму ў ідэалогіі. «Раб'е вучэнне» Феадосія Касога.

Жывапіс. Царкоўнае, свецкае і абароннае дойлідства. Ансамбль Маскоўскага Крамля. Фёдар Конь. Паступовы адыход ад царкоўных канонаў у мастацтве.

**І.14. Расія ў канцы XVI — пачатку XVII ст.** Гаспадарчае разарэнне 70—80-х гг. XVI ст. Узмацненне запрыгоньвання сялян. Указы аб сялянах і халопах. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. Праўленні Фёдара Іванавіча і Барыса Гадунова. Пачатак «Смуты». Паўстанне Хлопка.

Міжнароднае становішча Расійскай дзяржавы. Вайна са Швецыяй. Цяўзінскі мір. Умацаванне заходняй мяжы. Гады перамір'я з Рэччу Паспалітай.

Ілжэдзмітрый І. Паўстанне ў Маскве ў маі 1606 г. Васіль Шуйскі, яго сацыяльная і знешняя палітыка. Пачатак інтэрвенцыі Рэчы Паспалітай у Расію.

Ілжэдзмітрый ІІ. Барацьба супраць інтэрвентаў. «Сямібаяршчына». Акупацыя Масквы. Першае апалчэнне, прычыны яго распаду. Арганізацыя Другога апалчэння. Кузьма Мінін і Дзмітрый Пажарскі. Вызваленне Масквы. Земскі сабор 1613 г. Пачатак праўлення Раманавых. Сталбоўскі мір. Дэўлінскае перамір'е.

**І.15. Украіна ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI — першая палова XVII ст.).**

Люблінская унія 1569 г. і Украіна.

Змены ў гаспадарчым жыцці. Міграцыя насельніцтва. Дзеянне Літоўскага статута 1588 г. ва Украіне. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права.

Рэфармацыйны рух. Контррэфармацыя. Езуіты. Крызіс праваслаўнай царквы. Інцыдэнт вакол каляндарнай рэформы. Праваслаўныя брацтвы. Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. Рэлігійная палеміка. Сеймавая апазіцыя уніі.

Каронны ўрад і казацтва. Рэестравыя казакі. Адміністрацыйна-палітычны лад Запарожскай Сечы. Казацкія паходы супраць татар і турак, рэакцыя на іх кароннага ўрада. Пастановы Сейма адносна Запарожжа.

Казацка-сялянскія паўстанні пад кіраўніцтвам Крыштафа Касінскага і Севярына Налівайкі.

Гетман Пётр Сагайдачны. Аднаўленне праваслаўнай іерархіі ва Украіне. Мітрапаліт Іоў Барэцкі. Казацка-сялянскія рухі 1625 і 1630 гг. Легалізацыя праваслаўнай царквы. Мітрапаліт Пётр Магіла. Мерапрыемствы Кароны па ізаляцыі запарожцаў.

Народныя паўстанні 1637—1638 гг. «Ардынацыя Войска Запарожскага рээстравага». «Залаты спакой».

**І.16. Нацыянальна-культурны ўздым ва Ўкраіне (другая палова XVI — першая палова XVII ст.).** Асветніцтва. Дзейнасць Львоўскага

праваслаўнага брацтва. Арганізацыя школ. Астрожская акадэмія. Кіева-Магілянскі калегіўм. Школьныя тэатры.

Пачатак кнігадрукавання. Дзейнасць Івана Фёдарава ва Украіне. Яго паслядоўнікі.

Здабыткі і асаблівасці ўкраінскага фальклору. Працяг летапісання. Новы ўзровень літаратурнай творчасці. Палемічныя творы. Іаан Вішэнскі.

Культавае і свецкае дойлідства. Архітэктурныя стылі. Іконапіс і манументальны жывапіс.

Культурна-нацыянальны ўздым — адна з перадумоў падзей 1648—1654 гг. ва Украіне.

## *РАЗДЗЕЛ II.* РАСІЯ І УРАІНА Ў XVII—XVIII стст.

### II.1. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі ў XVII ст.

Тэрыторыя і насельніцтва. Саслоўная структура. Уздзеянне вынікаў «Смуты» на эканамічнае развіццё. Шляхі пераадолення гаспадарчага заняпаду. Фінансавая палітыка. Эвалюцыя форм феадальнага землеўладання і гаспадаркі.

Пашырэнне грамадскага падзелу працы і таварнай вытворчасці. Першыя мануфактуры і іх характар. Горад у XVII ст. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю, узмацненне купецтва. Гандлёвы і Новагандлёвы статуты.

Органы ўлады, цэнтральнае і мясцовае кіраванне. Земскія саборы. Узмацненне самаўладства, пачатак пераходу да абсалютызму. Войска. «Саборнае Укладанне» аб пытаннях сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага жыцця. Асобы цароў Міхаіла і Аляксея Раманавых.

Рэфармаванне Царквы і яе раскол. Нікан і Авакум.

Абвастрэнне сацыяльных адносін. Гарадскія паўстанні сярэдзіны і другой паловы XVII ст. Народны рух пад кіраўніцтвам Сцяпана Разіна, яго асаблівасці, ход падзей і вынікі.

**II.2. Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Расіі ў XVII ст.** Напрамкі знешняй палітыкі. Расійска-польскія і расійска-шведскія адносіны. Вайна 1632—1634 гг. з Рэччу Паспалітай. Барацьба з крымскай пагрозай. Будаўніцтва Белгародскай засекі. «Азоўскае сядзенне».

Пачатак вайны з Рэччу Паспалітай з-за Левабярэжнай Украіны. Віленскае перамір’е. Вайна са Швецыяй. Валіесарскае перамір’е і Кардыскі мір. Працяг вайны з Рэччу Паспалітай. Андрусаўскае перамір’е 1667 г. «Вечны мір» 1686 г.

Палітыка Расіі на Левабярэжнай Украіне. Турэцка-крымскі наступ. Чыгірынскія паходы 1677—1678 гг. Бахчысарайская дамова 1681 г. Крымскія паходы 1687 і 1689 гг.

Асваенне Сібіры і Далёкага Ўсходу землепраходцамі (С. Дзяжнёў, Е. Хабараў, У. Атласаў і інш.). Расія і краіны Далёкага Усходу, Цэнтральнай і Пярэдняй Азіі.

Вынікі знешняй палітыкі Расіі ў XVII ст.

**II.3. Вызваленчая вайна ўкраінскага народа. Палітычныя стасункі Левабярэжнай Украіны з Расійскай дзяржавай.** Прычыны Вызваленчай вайны. Б. Хмяльніцкі. Вызваленне паўстанцамі Запарожскай Сечы. Змяненні ў адносінах з Крымам. Разгром польска-шляхецкіх войскаў ва ўрочышчы Жоўтыя Воды і пад Корсунем. Пераўтварэнне казацкага паўстання ў агульнанародную барацьбу з прыгнятальнікамі.

Падрыхтоўка да новых баёў. Бітва пад Піляўцамі. Заходні паход паўстанцкай арміі. Летняя кампанія 1649 г. Збораўская дамова.

Антыпрыгонныя выступленні сялян. Малдаўскі паход казацка-татарскага войска. Адносіны з Турцыяй. Узнаўленне барацьбы з Каронай. Бітва пад Берастэчкам. Белацаркоўская дамова. Пагроза грамадзянскай вайны. Бітва пад Батогам. Змяненне сацыяльнай палітыкі Б. Хмяльніцкага. Процістаянне пад Жванцам.

Пераяслаўская рада. Сакавіцкія артыкулы. Паход казакаў І. Залатарэнкі на беларускія землі. Барацьба супраць польскай і татарскай агрэсіі на Правабярэжнай Украіне. Новы паход на заходнеўкраінскія землі. Расійска-украінскія супярэчнасці. Рэйд А. Ждановіча. Смерць Б. Хмяльніцкага.

Узвышэнне І. Выгоўскага. Пачатак грамадзянскай вайны. Гадзяцкі дагавор. Канатопская бітва. Пераяслаўскія артыкулы Ю. Хмяльніцкага. Раскол Украіны і пачатак «вайны берагоў».

Утварэнне Маларасійскага прыказа ў Маскве. І. Брухавецкі. Падзел Украіны паводле Андрусаўскага перамір'я. Хваляванні на Левабярэжжы. Гетман П. Дарашэнка. Глухаўскія артыкулы Д. Мнагагрэшнага. Пачатак палітычнай стабілізацыі. І. Самайловіч. «Вечны мір» 1686 г. і Украіна.

**II.4. Культура Расіі ў XVII ст.** Узмацненне свецкіх элементаў у культуры. Пашырэнне культурных сувязей з Заходняй Еўропай. Беларускі і ўкраінскі ўплыў. Роля Царквы ў развіцці культуры. Грамадска-палітычная думка (Ю. Крыжаніч, А. Ардын-Нашчокін і інш.).

Матэрыяльная культура. Дэкаратыўнае мастацтва.

Народная творчасць, яе формы і накірункі.

Узровень адукаванасці насельніцтва. Школа і асветніцтва. Дзейнасць Славяна-грэка-лацінскай акадэміі. С. Мядзведзеў. Развіццё гістарычных ведаў. «Сінопсіс» — падручнік рускай гісторыі. «Скіфская гісторыя» аб барацьбе з мангола-татарамі. Геаграфічныя адкрыцці.

Традыцыйныя і новыя жанры літаратуры (свецкія, сатырычныя, біяграфічныя аповесці). Апошнія рускія летапісы. Нараджэнне рыфмаванай паэзіі. С. Полацкі. К. Істомін.

Новыя рысы ў дойлідстве і жывапісу. Драўлянае дойлідства. Палац у Каломенскім. Шатровыя і ярусныя цэрквы. «Нарышкінскае барока». Асноўныя накірункі жывапісу. Парсуна. Мастакі С. Ушакоў, М. Паўлавец, П. Чырын і інш.

Музыка і народны тэатр.

Лад жыцця, менталітэт народаў Расіі.

**II.5. Унутрыпалітычнае становішча Расіі ў канцы XVII ст. Рэформы першай чвэрці XVIII ст.** Цар Фёдар Аляксеевіч. Адмена месніцтва. Барацьба

прыдворных груповак за ўладу. Стралецкі бунт 1682 г. «Хаваншчына». Рэгенства Соф'і. Пачатак праўлення Пятра І. Стралецкі бунт 1698 г.

Становішча ў эканоміцы (сельская гаспадарка, рамяство, мануфактурная вытворчасць, гандаль). Заснаванне ўральскіх заводаў. Фінансавая і мытная палітыка. Тарыф 1724 г.

Сацыяльная палітыка Пятра І. Указ аб адзінаспадчыннасці. Падушны падатак.

Узмацненне і распаўсюджванне прыгонніцтва. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Барацьба Пятра І з апазіцыяй. Дзейнасць Прэабражэнскага прыказа і Тайнай канцылярыі. «Справа» царэвіча Аляксея. Астраханскае паўстанне і хваляванні на Доне і ў Паволжы. К. Булавін.

Рэформы апарату ўлады і кіравання. Пётр І і Царква. Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэформы. Гарадская рэформа. Ваенная рэформа.

Фарміраванне чыноўніцка-бюракратычнага апарату. Табель аб рангах. Ваенна-паліцэйскі характар дзяржавы. Расія як імперыя. Асоба Пятра І.

**ІІ.6. Знешняя палітыка Расіі (канец XVII — першая чвэрць XVIII ст.).** Абставіны і перспектывы ўнутранага развіцця Расіі і іх ўплыў на знешнюю палітыку.

Азоўскія паходы Пятра І. «Вялікае пасольства». Дыпламатычная і ваенная падрыхтоўка Паўночнай вайны. Стварэнне «Паўночнага саюза». Пачатак барацьбы са Швецыяй. Асноўныя этапы вайны. Ад Нарвы да Палтавы. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Дамова Карла XII з І. Мазепам. Палтаўская бітва і яе вынікі. Пазіцыя Турцыі. Пруцкі паход Пятра І. Ваенныя дзеянні на Балтыцы (Гангут, Грэнгам). Аландскі кангрэс.

Ніштацкі мір. Новы расклад сіл у Еўропе. Расія і еўрапейскія краіны.

Мэты і характар усходняй палітыкі Пятра І. Каспійскі паход расійскай арміі.

«Птушаняты гнязда Пятрова» — дзяржаўныя дзеячы і палкаводцы (Б. Шарамецеў, А. Меншыкаў, П. і Ф. Апраксіны, Ф. Лефорт, П. Талстой, І. Бутурлін, Р. Скарнякоў-Пісараў, Ф. Галавін, Г. Галоўкін, Р. і Я. Брусы, П. Шафіраў, А. Макараў, Ф. Рамаданаўскі, П. Ягужынскі і інш.).

**ІІ.7. Культура Расіі на рубяжы XVII—XVIII стст.** Узмацненне свецкага накірунку ў развіцці, характары і сутнасці культуры. Роля еўрапейскага ўплыву. Рэформы Пятра І у галіне культуры.

Стварэнне свецкай школы. Ваенныя вучэбныя ўстановы. Абавязковы характар навучання. Кнігавыдавецтва. Увядзенне грамадзянскага шрыфту, арабскіх літар, новага летазлічэння.

Вучэбная і навуковая літаратура. Новыя сюжэты і формы мастацкай літаратуры.

Гістарычная, эканамічная і грамадска-палітычная думка і яе прадстаўнікі (А. Манкіеў, В. Тацішчаў, І. Пасашкоў, Ф. Пракаповіч і інш.). Заснаванне Акадэміі навук. Навуковыя экспедыцыі. У. Атласаў. Тэхнічныя здабыткі. Вынаходцы А. Нартаў, В. дэ Генін і інш.

Змены ў архітэктуры грамадзянскіх і царкоўных будынкаў. Новыя падыходы ў горадабудаўніцтве. Архітэктары Санкт-Пецярбурга. Прыдворныя жывапісцы і гравёры (І. Нікіцін, А. Мацвееў, А. і І. Зубавы).

Змены ў побыце і светапоглядзе розных катэгорый насельніцтва (жыллё, вопратка, ежа, паводзіны, рэлігійнасць, адносіны да ўлад, вольны час, умовы працы і інш.).

**II.8. Унутраная і знешняя палітыка Расіі пры пераймальніках Пятра І (1725—1762 гг.).** Барацьба за ўладу пасля смерці Пятра І. Час палацавых пераваротаў. Кацярына І. Сутнасць і роля Вярхоўнага Тайнага Савета. Пётр ІІ. «Вярхоўнікі» і ўзыход на трон Ганны Іванаўны. «Біронаўшчына». Праблема ролі іншаземцаў у кіраванні краінай. Уладаранне Лізаветы Пятроўны. Пётр ІІІ. Лёс пятроўскіх рэформаў.

Пашырэнне правоў і прывілеяў дваранства. Стан сельскагаспадарчай і мануфактурнай вытворчасці. Далейшае развіццё гандлю. Адмена ўнутраных мытняў (1753).

Мэты і праблемы знешняй палітыкі. Яе праваднікі (палітыкі і военачальнікі — Б. Мініх, П. Ласі і інш.). Войны з Крымскім ханствам, Турцыяй і Швецыяй у 1730—40-я гг. і іх вынікі. Адносіны з Рэччу Паспалітай. Удзел Расіі ў Сямігадовай вайне (мэта, ход падзей, палкаводцы С. Апраксін, П. Салтыкоў і інш.).

**II.9. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Расіі ў другой палове XVIII ст.** Тэрытарыяльныя прырошчванні (шляхі, метады, вынікі). Нацыянальны склад насельніцтва і нацыянальная палітыка самадзяржаўя. Земляробчае і прамысловае асваенне новых рэгіёнаў.

Стан сельскагаспадарчай вытворчасці (тэндэнцыі развіцця памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарак). Узмацненне прыгонніцтва. Заканадаўчая творчасць урада ў галіне эканомікі. Секулярызацыя царкоўных маёнткаў. Падатковая і фінансавая палітыка.

Мануфактура. Пашырэнне капіталістычнага ўкладу. Фарміраванне саслоўя прадпрымальнікаў, дынастый купцоў і заводчыкаў. Работныя людзі.

Рост таварнай гаспадаркі. Унутраны і знешні гандаль. Расійскі горад і яго роля ў эканоміцы.

Стварэнне і дзейнасць Вольнага эканамічнага таварыства.

**II.10. Час Кацярыны ІІ і Паўла І: унутраная палітыка ва ўмовах узмацнення сацыяльнага супрацьстаяння.** Пераварот 1762 г., яго ўдзельнікі. Фаварыты і атачэнне Кацярыны ІІ (браты Р. і А. Арловы, Р. Пацёмкін, К. Дашкава і інш.). Выбары і дзейнасць Укладальнай камісіі 1767—1768 гг. Яе сацыяльны склад. «Наказ» імператрыцы. Характар патрабаванняў розных груп дэпутатаў. Сутнасць ліберальнага курсу ўрада.

Прыгонніцкія законы 1760-х гг. Узмацненне сацыяльнай напружанасці. «Чумны бунт» 1771 г. Сялянская вайна 1773—1775 гг. Рэакцыя на яе грамадства і ўрада. Е. Пугачоў і яго паплечнікі.

Умацаванне бюракратычнага апарату. «Установа аб губернях». «Даравальныя граматы» дваранству і гарадам.

Расійскае асветніцтва ў самадзяржаўнай і дэмакратычнай выявах. Апазіцыйная думка (М. Навікоў, А. Радзішчаў і інш.) і рэакцыя на яе з боку ўрада. Расійскае самадзяржаўе і рэвалюцыйныя падзеі ў Францыі.

Асоба Кацярыны II. Прыход да ўлады Паўла I; яго адносіны да палітыкі папярэднікаў і спробы рэформ. Сацыяльная палітыка Паўла I. Рэфармаванне арміі. Фінансавая палітыка. Мэты і характар праведзеных змен. Забойства імператара.

**II.11. Знешняя палітыка Расіі ў другой палове XVIII ст.** Расія ў сістэме еўрапейскіх адносін. Накірункі і мэты знешняй палітыкі Расіі. Шляхі і характар рэалізацыі знешнепалітычных планаў.

Расійска-турэцкія войны (прычыны і непасрэдныя падставы, ваенныя дзеянні на сушы і на моры, вынікі). Замацаванне Расіі на Чорным моры. Далучэнне Крыма і Прыкубання. Засяленне Паўночнага Прычарнамор'я.

Вайна са Швецыяй. Дзеянні балтыйскага флоту.

Удзел Расіі ў першым і другім падзелах Рэчы Паспалітай. Шляхі асваення новых тэрыторый. Разгром паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі і трэці падзел.

Расія і народы Закаўказзя. Адносіны з сярэднеазіяцкімі ханствамі. Далучэнне казахскіх жузаў.

Расійскія першапраходцы на Далёкім Усходзе. Заснаванне Расійска-амерыканскай кампаніі.

Удзел Расіі ў антыфранцузскіх кааліцыях. Італьянскі і Швейцарскі паходы расійскай арміі.

Галоўныя вынікі знешняй палітыкі. Расійскія дыпламаты і военачальнікі (Н. Панін, Р. Пацёмкін, П. Румянцаў, А. Сувораў, Р. Спірыдаў, Ф. Ушакоў і інш.).

**II.12. Культура Расіі ў сярэдзіне і другой палове XVIII ст.** Паглыбленне рацыяналізму ў накірунках культуры. Станаўленне расійскай навуковай школы. Дзейнасць Акадэміі навук. М. Ламаносаў. Прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі. Гістарычная навука (гісторыкі Г. Мілер, А. Шлёцар, М. Шчарбатаў, І. Болцін, І. Голікаў і інш.) і гістарычнае крыніцазнаўства. Вольнае эканамічнае таварыства. Эканамісты А. Болатаў, М. Чулкоў.

Экспедыцыі В. Берынга, А. Чырыкава, С. Крашанінннікава, І. Ляпёхіна, П. Паласа і іх геаграфічныя адкрыцці.

Стылёвая і жанравая мнагастайнасць літаратуры. Творчасць А. Канцяміра, В. Традзіякоўскага, М. Ламаносава, Дз. Фанвізіна, Р. Дзяржавіна, М. Карамзіна, А. Радзішчава, І. Крылова.

Асветніцтва і асветнікі. Грамадска-палітычная думка і публіцыстыка. Станаўленне перыядычнага друку. Кнігавыдавецтва. М. Навікоў.

Ф. Волкаў і ўзнікненне прафесійнага тэатра. Музычнае мастацтва (духоўная і свецкая музыка, яе стваральнікі).

Дасягненне новага ўзроўню выяўленчага мастацтва. Яго асноўныя стылі і жанры. Мастакі Ф. Рокатаў, Дз. Лявіцкі, У. Баравікоўскі і інш. Гравюра і графіка. Скульптары Ф. Шубін, М. Казлоўскі. Творчасць архітэктараў

В. Растрэлі, В. Бажэнава, М. Казакова, І. Старова і інш. Заснаванне Акадэміі мастацтваў.

Урадавая палітыка ў галіне культуры. Сістэма школьнай адукацыі, яе арганізатары. Стварэнне і дзейнасць Маскоўскага ўніверсітэта.

Народная творчасць і фальклор. Асаблівасць побыту і ўкладу жыцця розных груп насельніцтва.

**II.13. Левабярэжная Украіна ў канцы XVII — XVIII ст.** Праблема статуса Гетманшчыны. Органы вышэйшай улады. Ваенна-палітычнае ўладкаванне. Судовая сістэма. Расійская адміністрацыя на Левабярэжжы.

Каламакскія артыкулы. І. Мазепа — палітычны і ваенны дзеяч.

Гетманшчына ў войнах Расіі з Турцыяй і Крымскім ханствам. Пачатак Паўночнай вайны і ўкраінскае Левабярэжжа. Змяненне знешнепалітычнай арыентацыі часткі старшыны. Адкрыты пераход гетмана І. Мазепы на бок шведаў. Наступствы Палтаўскай бітвы. Старшынская эміграцыя. П. Орлік і яго “Канстытуцыя”.

Рэшацілаўскія артыкулы. Міністры-рэзідэнты. Эксплуатацыя матэрыяльных і людскіх рэсурсаў Гетманшчыны. Заснаванне Маларасійскай калегіі. Міжгетманства. Контррэформы 1725—1727 гг. Д. Апостал. «Рашучыя пункты». Часовая стабілізацыя ўнутранага жыцця. Рэвізія землеўладанняў. Кадыфікацыя права. Пачатак узвядзення Украінскай лініі ўмацаванняў. Міністэрскае праўленне.

Узнаўленне гетманства. К. Разумоўскі. Судовая рэформа.

Канчатковая ліквідацыя гетманства. Кіраванне Украінай пры Паўле І.

Дэмаграфічная сітуацыя на Левабярэжжы ў канцы XVII—XVIII ст. Сацыяльная структура грамадства. Сельская гаспадарка. Фарміраванне феадальна-старшынскага і манастырскага землеўладання. Расійскія памешчыкі ва Украіне. Рамяство, промыслы, мануфактурная вытворчасць. Гандаль. Поўнае запрыгоньванне сялян. Антыфеадальныя выступленні сялян і казакоў.

**II.14. Слабадская Украіна ў XVII — XVIII стст.** Каланізацыя края. Колькасць насельніцтва, яго этнічны склад. Сацыяльная структура. Землеўладанне. Гаспадарчае жыццё. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. Кіраўніцтва слабадскімі палкамі. Палітыка ўрада Лізаветы Пятроўны. Канчатковая ліквідацыя палкавога ўладкавання.

**II.15. Запарожская Сеч у другой палове XVII — XVIII ст.** Сеч у палітычных падзеях ва Ўкраіне ў другой палове XVII ст. Авантура П. Петрыка. Запарожска-татарскія адносіны ў пачатку XVIII ст. Запарожцы і К. Булавін.

Запарожцы ў расійска-шведскім супрацьстаянні 1709 г. Разбурэнне Сечы. Запарожскія казакі пад пратэктаратам Крымскага ханства.

Вяртанне запарожцаў у расійскае падданства. Грамадска-палітычнае ўладкаванне Новай Сечы. Гаспадарчае жыццё. Паўстанні супраць старшыны.

Наступ расійскага ўрада на «Вольнасці Войска Запарожскага». Ліквідацыя Новай Сечы. Лёс запарожскага казацтва.

**II.16. Правабярэжная Украіна ў канцы XVII — XVIII ст.** Эпоха запусцення. Руіна. Каронная ўлада і адраджэнне казацкіх палкоў. Паўстанне 1702—1704 гг.

Правабярэжжа ў міжнародна-прававых актах 1711—1714 гг. Новая хваля польскай каланізацыі. Надворныя казакі. Сялянскае пытанне. Распаўсюджванне уніі і знікненне праваслаўнай іерархіі. Замойскі сабор.

Узнікненне гайдамацтва. Паўстанне 1734—1738 гг. Гайдамацкі рух 1750 г. Новае абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Дысідэнцкае пытанне. Барская канфедэрацыя. Каліеўшчына. М. Жалязняк і І. Гонта. Уключэнне Правабярэжжа ў склад Расіі.

**II.17. Заходнеўкраінскія землі ў другой палове XVII — XVIII ст.** Заходнеўкраінскія землі ў складзе Польшчы. Змены ў царкоўным жыцці.

Пераход Закарпацця пад уладу Габсбургаў. Украінцы ў антыгабсбургскім паўстанні 1703—1711 гг. Сацыяльна-эканамічныя працэсы ў Закарпацці. Мукачаўская грэка-каталіцкая епархія.

Паўночная Букавіна ў складзе Малдаўскага княства. Захоп Букавіны Аўстрыяй.

Ачагі праваслаўя на заходнеўкраінскіх землях. Рух апрышкаў. А. Доўбуш.

Каралеўства Галіцыі і Ладамерыі. Рэформы Марыі Тэрэзіі і Іосіфа II.

**II.18. Культура ўкраінскіх зямель у другой палове XVII — XVIII ст.** Умовы і тэндэнцыі развіцця культуры. Здабыткі грамадска-палітычнай думкі. Дзейнасць Кіева-Магілянскай акадэміі і іншых асветніцкіх і адукацыйных устаноў. Працяг кнігадрукавання.

Навука. Назапашванне гістарычных ведаў («Сінопсіс», казацка-старшынскія летапісы Самавідца, Грабянкі, Вялічкі). Літаратура і яе жанры. Паэзія. Філосаф і паэт Р. Скаварада.

Узрастанне рэалістычных накірункаў у станковым і манументальным жывапісе. А. Ласенка, У. Баравікоўскі, Дз. Лявіцкі. Графіка. Скульптура. Фартыфікацыйнае і культавае будаўніцтва. Украінскае барока, Архітэктары С. Каўнір, І. Грыгаровіч-Барскі. Драўлянае дойлідства. Асаблівасці заходнеўкраінскай архітэктуры.

Лялечны тэатр «вяртэп». Школьны тэатр. Пачатак прафесійнага тэатра. Народная музыка. Цэхі музыкантаў. Музыкальныя школы. Кампазітары М. Беразоўскі, Дз. Бартнянскі.

Традыцыі, звычаі, культура паўсядзённага жыцця ўкраінцаў. Рэгіянальныя асаблівасці.

## *РАЗДЗЕЛ III.* РАСІЯ І УКРАІНА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

**III.1. Адміністрацыйна-палітычная сістэма і сацыяльна-эканамічнае развіццё Расіі ў першай палове XIX ст.** Дзяржаўны лад Расійскай імперыі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне краіны. Насельніцтва (колькасць, сацыяльны, канфесіянальны і этнічны склад). Гаспадарчая спецыялізацыя рэгіёнаў імперыі.

Развіццё сельскай гаспадаркі. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Развіццё капіталістычных адносін у прамысловасці. Пачатак прамысловага перавароту і яго асаблівасці. Развіццё ўнутранага рынку і знешняга гандлю. Фінансы. Стан транспарту.

**III.2. Унутраная палітыка самадзяржаўя ў першай чвэрці XIX ст.** Пераварот 1801 г. Аляксандр I. Нягласны камітэт. Палітыка ўрада па сялянскім пытанні. Указ аб «вольных хлебаробах». Стварэнне міністэрстваў і іх рэфарміраванне. Урадавая палітыка ў галіне асветы. Рэформа Сената. Дзейнасць М. М. Сперанскага і яго план дзяржаўных пераўтварэнняў. Стварэнне Дзяржаўнага савета.

Унутрыпалітычнае развіццё ў 1815—1825 гг. Спробы канстытуіравання: Польская канстытуцыя 1815 г., праект М. М. Навасільцава. Сялянскае пытанне. Аракчэеўшчына. Ваенныя пасяленні. Урадавая палітыка ў галіне асветы і культуры.

**III.3. Знешняя палітыка Расіі ў першай чвэрці XIX ст.** Міжнароднае становішча і асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст. Расія ў антыфранцузскіх кааліцыях. Тыльзіцкі мір і яго вынікі. Вайна са Швецыяй. Утварэнне Вялікага княства Фінляндскага. Далучэнне Грузіі да Расійскай дзяржавы. Войны з Іранам і Турцыяй.

Міжнародныя адносіны напярэдадні вайны 1812 г. Пачатак вайны і адступленне расійскай арміі. М. Б. Барклай дэ Толі, П. І. Баграціён, М. І. Кутузаў. Барадзінская бітва. Пакіданне Масквы. Народны характар вайны. Пераход расійскай арміі ў контрнаступленне і разгром напалеонаўскай арміі.

Ваенная кампанія 1813—1814 гг. «Бітва народаў». Уваход расійскай арміі ў Парыж. Венскі кангрэс. Утварэнне і дзейнасць «Свяшчэннага Саюза».

**III.4. Унутраная палітыка царскага ўрада ў другой чвэрці XIX ст.** Самадзяржаўе Мікалая I. Узмацненне рэпрэсіўных мерапрыемстваў. Цэнзура. Сакрэтны камітэт 6 снежня 1826 г. Уласная яго імператарскай вялікасці канцылярыя. Кадыфікацыя. Трэцяе аддзяленне. Корпус жандараў.

Умацаванне саслоўных пазіцый дваранства. Палітыка ўрада ў сялянскім пытанні. Рэформа кіравання дзяржаўнымі сялянамі. П. Дз. Кісялёў. Фінансавая рэформа Я. Ф. Канкрына. Друк і асвета ва ўрадавай палітыцы.

**III.5. Знешняя палітыка Расіі ў другой чвэрці XIX ст.** Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Расіі.

Усходняе пытанне. Руска-іранская вайна 1826–1828 гг.. Далучэнне Ўсходняй Арменіі да Расіі. Руска-турэцкая вайна 1828–1829 гг. Расія і вызваленне Грэцыі. Ункіяр-Іскелескі дагавор. Лонданскія канвенцыі.

Каўказская вайна. Супярэчлівы характар далучэння народаў Каўказа і Закаўказзя да Расіі.

Крымская вайна, яе прычыны і характар. Ваенныя дзеянні на Балканах і ў Закаўказзі. Бітва пры Сінопе. П. С. Нахімаў. Уступленне ў вайну Англіі і Францыі. Абарона Севастопаля. Парыжскі мір.

Буржуазныя рэвалюцыі 1830 і 1848—1849 гг. у Еўропе, рэакцыя на іх самадзяржаўя.

**III.6. Грамадскі рух і масавая барацьба ў першай чвэрці XIX ст.** Становішча народных мас. Паўстанне сялян на Доне. Хваляванні салдат Сямёнаўскага палка. Хваляванні ў ваенных пасяленнях.

Вызначэнне ідэйных плыняў. А. М. Галіцын і Біблейскае таварыства. Расійскае масонства. Дваранскае асветніцтва (А. С. Пушкін, А. С. Грыбаедаў, П. А. Вяземскі). Фарміраванне ідэалогіі, першыя дзекабрысцкія арганізацыі. Паўднёвае і Паўночнае таварыствы і праграмныя распрацоўкі. П. І. Пестэль, М. М. Мураў'ёў, К. Ф. Рылееў. Планы ўзброенага паўстання. Падзеі 14 снежня 1825 г. Выступленне Чарнігаўскага палка. Следства і суд над дзекабрыстамі.

**III.7. Грамадскі рух і масавая барацьба ў другой чвэрці XIX ст.** «Халерныя бунты». Паўстанне 1831 гг. у наўгародскіх ваенных пасяленнях.

Студэнцкія гурткі канца 1820-х — пачатку 1830-х гг. Польскае паўстанне 1830—1831 гг. і расійская грамадская думка. Гурток М. У. Станкевіча. П. Я. Чаадаеў і яго «Філасафічныя пісьмы».

Фарміраванне асноўных ідэйных напрамкаў у 1830—1840-я гг. С. С. Увараў. «Тэорыя афіцыйнай народнасці». М. П. Пагодзін, С. П. Шавыроў.

Пытанне аб шляхах гістарычнага развіцця Расіі ў грамадскай думцы. Славянафілы і заходнікі. А. С. Хамякоў, І. В. Кірэеўскі, К. С. і І. С. Аксакавы, Ц. М. Граноўскі.

Фарміраванне рэвалюцыйна-дэмакратычный ідэалогіі. В. Р. Бялінскі, А. І. Герцэн.

Ідэі ўтапічнага сацыялізму ў Расіі. Гурткі петрашэўцаў.

Кірыла-Мяфодзіеўскае таварыства.

Расійскі грамадскі рух і рэвалюцыі ў Еўропе 1848—1849 гг.

**III.8. Украінскія землі ў складзе Расійскай імперыі у першай палове XIX ст.** Адміністрацыйнае уладкаванне ўкраінскіх зямель у складзе Расіі на прыканцы XVIII — пачатку XIX ст. Тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сельская гаспадарка. Прамысловая вытворчасць. Гандаль. Правядзенне інвентарнай рэформы на Правабярэжнай Украіне. Дз. Г. Бібікаў.

Пачатак украінскага нацыянальнага адраджэння. Ідэя аднаўлення Гетманшчыны. Князь М. Р. Рэпнін. "История Малой России" Дз. М. Бантыш-Каменскага.

Выступленні ва Украіне пад кіраўніцтвам У. Кармалюка.

Дзейнасць дзекабрыстаў ва Украіне.

Польскі вызваленчы рух і Правабярэжная Украіна. Дзейнасць "Садружнасці польскага народа" ва Украіне. Ш. Канарскі.

"Кірыла-Мефодзьеўскае братэрства". "Книга бытия народа украинскага». М. І. Кастамараў, Т. Р. Шаўчэнка, П. А. Куліш.

**III.9. Заходнеўкраінскія землі ў складзе Аўстрыйскай манархіі ў першай палове XIX ст.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне і насельніцтва Галічыны, Закарпацця і Паўночнай Букавіны. Сельская гаспадарка. Прамысловасць Гандаль. Аграрнае пытанне ў палітыцы Вены.

Сялянскі рух. Школа і царква. Заснаванне Галіцкай грэка-каталіцкай мітраполіі.

Славянскае адраджэнне ў Аўстрыйскай імперыі. Польскія тайныя таварыствы і ўкраінская інтэлігенцыя.

Абуджэнне нацыянальнай свядомасці ў часткі грэка-каталіцкага духавенства. І. Магільніцкі. «Руская тройца». Прааўстрыйскі накірунак грамадска-палітычнай думкі. Зараджэнне русафільства.

«Вясна народаў». Скасаванне паншчыны на заходнеўкраінскіх землях. Узнікненне ў Львове Цэнтральнай Рады Нарадовай. Галоўная Руская Рада, яе праграма і дзейнасць. Рускі Сабор. Абвастрэнне ўкраінска-польскага процістаяння. Удзел галічан у славянскім з'ездзе ў Празе. Украінцы — дэпутаты рэйхстага. Узброенае паўстанне ў Львове. Рэвалюцыйныя падзеі на Букавіне і ў Закарпацці. Сялянскае паўстанне пад кіраўніцтвам Л. Кабыліцы. Паражэнне рэвалюцыі 1848—1849 гг. і наступ рэакцыі.

**III.10. Культура Расіі ў першай палове XIX ст.** Грамадска-палітычныя ўмовы развіцця культуры.

Народная асвета. Асноўныя тыпы школ. Ваенныя навучальныя ўстановы. Жаночыя навучальныя ўстановы. Царскасельскі ліцэй і яго знакамітыя выпускнікі. Універсітэтская адукацыя. Фармаванне сістэмы вышейшай тэхнічнай адукацыі. Першыя публічныя бібліятэкі.

Друк. "Вестник Европы", "Московский телеграф", "Телескоп", "Современник", "Литературная газета", "Губернские ведомости". Буйнейшыя кнігавыдавецтвы. А. П. Смірдзін. Дзейнасць Н. П. Румянцава.

Навука і тэхніка. Геаграфічныя адкрыцці. І. Ф. Крузенштэрн, Ю. Ф. Лісянскі. М. П. Лазараў, Ф. Ф. Беллінсгаўзен. Матэматыка. М. І. Лабачэўскі. Астраномія. Заснаванне Пулкаўскай абсерваторыі. Развіццё фізікі і хіміі. Медыцына. М. І. Пірагоў. Гістарычная навука. М. М. Карамзін. М. П. Пагодзін. "Дзяржаўная школа" рускай гістарыяграфіі. Б. М. Чычэрын, К. Дз. Кавелін.

Асноўныя напрамкі развіцця літаратуры і іх прадстаўнікі. М. М. Карамзін, В. А. Жукоўскі. А. С. Грыбаедаў, А. С. Пушкін, М. Ю. Лермантаў, М. В. Гогаль. Літаратурная крытыка, В. Р. Бялінскі. Літаратурныя салоны.

Жывапіс. К. П. Брулоў, П. А. Федотаў, А. Г. Венецыянаў, А. А. Іваноў, А. А. Кіпрэнскі.

Архітэктура і скульптура. А. Дз. Захараў, А. Н. Вараніхін, К. І. Россі, В. І. Бове. І. П. Мартос, М. І. Козлоўскі, П. К. Клодт.

Тэатр і музычнае мастацтва. Масква — цэнтр тэатральнай культуры. Афіцыйна-парадны характар тэатраў Пецярбурга. Стылістычныя напрамкі ў музыцы. А. А. Алябьеў, А. Я. Варламаў. Творчасць М. І. Глінкі.

**III.11. Культура Украіны ў першай палове XIX ст.** Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы развіцця ўкраінскай культуры.Фактар культурнага памежжа. Народнае мастацтва — аснова развіцця украінскай культуры. Нацыянальнае адраджэнне і культура Украіны.

Сітэма адукацыі. Універсітэты Усходняй Украіны — буйнейшыя цэнтры украінскай і расійскай навукі. Гімназія вышэйшых навук князя І. А. Безбародка. Развіццё прафесійнай адукацыі.

Нацыянальна-культурны рух ва Украіне і развіццё мовазнаўства, гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыкі. "История Руссов". "История Малой России" Дз. М. Бантыш-Каменскага. "История Малороссии" А. М. Марковича. Выдавецкая дзейнасць О. М. Бадзянскага. Навуковая дзейнасць М. І. Кастамарава. Дзейнасць "Часовай археаграфічнай камісіі". Вусная народная творчасць.

Нацыянальнае адраджэнне ў заходнеукраінскіх землях. Уплыў грэка-каталіцкай царквы на развіццё культуры ва Усходняй Галіцыі і Закарпацце. Асветніцкая дзейнасць "Рускай тройцы".

Умовы развіцця літаратуры і мастацтва. Уклад Т. Р. Шаўчэнкі ў развіццё ўкраінскай культуры. Нацыянальныя рысы ў творах П. П. Гулака-Арцямоўскага, ,Р. Ф. Квіткі-Аснаўяненка, І. П. Катлярэўскага

Музычная творчасць. В. Н. Верасай. Жывапіс. Архітэктура і скульптура.

## *РАЗДЗЕЛ IV.* РАСІЯ І УКРАІНА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX — ПАЧАТКУ XX ст.

**IV.1. Адмена прыгоннага права ў Расіі. Унутраная палітыка самадзяржаўя ў 1860—1870-х гг.** Паглыбленне крызісу прыгоннай гаспадаркі напярэдадні рэформы 1861 г.

Падрыхтоўка адмены прыгоннага права. Я. І. Растоўцаў, М. А. Мілюцін. Маніфест і «Палажэнні» 19 лютага 1861 г.

Асноўныя накірункі рэформы. Прававое становішча сялянства. Часоваабавязаны стан. Надзелы і павіннасці сялян. Сялянскія ўстановы. Міравыя пасрэднікі. Складанне ўстаўных грамат. Заключэнне выкупных здзелак. Адказ сялян на рэформу.

Адмена прыгоннага права на ўдзельных землях. Законы аб дзяржаўных сялянах.

Агульная характарыстыка і асноўныя этапы ўнутранай палітыкі ўрада. «Асветная бюракратыя». Вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч. Праціўнікі рэформ. Узмацненне кансерватыўных тэндэнцый у палітыцы самадзяржаўя ў канцы 1860-х гг.

Рэформы ў галіне мясцовага кіравання. Новыя судовыя статуты. Рэформы ў галіне асветы. А. В. Галаўнін, Дз. А. Талстой. Цэнзурныя правілы. Фінансавыя рэформы. Ваенныя рэформы. Дз. А. Мілюцін.

Крызіс урадавай палітыкі на мяжы 1870—1880-х гг. М. Т. Ларыс-Мелікаў і яго праграма. Забойства Аляксандра ІІ.

**IV.2. Унутраная палітыка расійскага ўрада ў 1881—1894 гг.** Аляксандр ІІІ. Маніфест аб непахіснасці самадзяржаўя. К. П. Пабеданосцаў. Міністэрства М. П. Ігнацьева. Перамога кансерватараў. Дзейнасць М. Н. Каткова. Дз. А. Талстой. Курс урада на "контррэформы". Палітыка ў

сялянскім пытанні. Ахавальныя мерапрыемствы ў галіне асветы і друку. Палажэнне аб земскіх начальніках. Земская і гарадская “контррэформы”.

**IV.3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Расіі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Тэрыторыя Расіі ў другой палове XIX ст. Усерасійскі перапіс 1897 г. Сацыяльная, нацыянальная і канфесійная структура насельніцтва.

Эвалюцыя сельскай гаспадаркі. Сельская абшчына ў парэформенай Расіі.

Асноўныя этапы развіцця капіталізму ў прамысловасці. Завяршэнне прамысловага перавароту. Развіццё фабрычна-заводскай прамысловасці. Чыгуначнае будаўніцтва. Развіццё капіталізму ўшыр. Стварэнне новых прамысловых цэнтраў. Замежны капітал. Фарміраванне прамысловага пралетарыяту і буржуазіі.

Прамысловы ўздым 1890-х гг. Эканамічны крызіс і дэпрэсія 1900—1908 гг. Прамысловы ўздым 1909—1913 гг. Эканоміка Расіі ў гады Першай сусветнай вайны.

Транспартная сістэма краіны. Банкі і іх роля ў эканоміцы Расіі. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.

Расійскі манапалістычны капіталізм і яго асаблівасці.

**IV.4. Знешняя палітыка Расіі ў другой палове XIX ст.** Міжнароднае становішча Расіі пасля Крымскай вайны. Барацьба расійскай дыпламатыі за перагляд Парыжскага міру. А. М. Гарчакоў. М. П. Ігнацьеў. Адмена нейтралізацыі Чорнага мора. «Саюз трох імператараў». Ваенная трывога 1875 г. у Еўропе і пазіцыя Расіі.

Эканамічныя і палітычныя інтарэсы Расіі на Сярэднім Усходзе. Далучэнне Казахстана і Сярэдняй Азіі да Расіі.

Далёкаўсходняя палітыка Расіі. Узаемаадносіны з Кітаем і Японіяй. Продаж Аляскі.

Барацьба славянскіх народаў супраць турэцкага ярма і адносіны да яе расійскіх улад і грамадства. Руска-турэцкая вайна 1877—1878 гг. Сан-Стэфанскі мір. Берлінскі кангрэс.

Англа-рускія супярэчнасці на Сярэднім Усходзе. Новая расстаноўка сіл на міжнароднай арэне. Утварэнне Траістага саюза. М. К. Гірс. Заключэнне руска-французскага саюза.

**IV.5. Грамадска-палітычны рух у 1860—1890-я гг.** Кансерватыўная думка. Ліберальны рух. Цвярскі адрас 1862 г. Сялянскі і рэвалюцыйна-дэмакратычны рух. «Зямля і воля» 1860-х гг. М. Г. Чарнышэўскі. Грамадская думка ў сярэдзіне і другой палове 1860-х гг. «Русское слово» і Дз. І. Пісараў. Рэвалюцыйныя гурткі. М. А. Ішуцін, Г. А. Лапацін, С. Г. Нячаеў. Замах Дз. У. Каракозава. Руская секцыя I Інтэрнацыянала.

Земска-ліберальны рух. М. Ф. Аненскі, І. П. Белаконскі, У. Г. Караленка, І. І. Петрункевіч. Цэнтры прыцягнення апазіцыйнай інтэлігенцыі ў Пецярбургу і Маскве. Імператарскае вольнае эканамічнае таварыства. Юрыдычнае таварыства.

Расійскія часопісы «Современник», «Дело», «Отечественные записки».

Рэвалюцыйнае народніцтва 1870-х гг. П. Л. Лаўроў. М. А. Бакунін. П. М. Ткачоў. Народніцкія гурткі першай паловы 1870-х гг. «Хаджэнне ў народ». «Зямля і воля». «Народная воля» і «Чорны перадзел».

Ідэі марксізму ў Расіі. Г. В. Пляханаў. Група «Вызваленне працы». Марксісцкія гурткі 1880-х — пачатку 1890-х гг.

Сялянскі і рабочы рух. «Паўднёварасійскі саюз рабочых», «Паўночны саюз рускіх рабочых». Я. В. Заслаўскі, П. А. Аляксееў, В. П. Абнорскі, С. М. Халтурын. Марозаўская стачка.

**IV.6. Расійскае самадзяржаўе ў 1894—1904 гг.** Дзяржаўны лад Расіі. Мікалай II. Урадавы лагер. К. П. Пабеданосцаў. Ліберальны накірунак бюракратычнай думкі. М. Х. Бунге. Эканамічная платформа С. Ю. Вітэ. Аграрная палітыка ўрада. «Асобая нарада аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці». Маніфест 26 лютага 1903 г. Палітыка ўрада па рабочым пытанні. «Паліцэйскі сацыялізм».

Курс В. К. Плеве на ўмацаванне самадзяржаўнага ладу. Пазіцыя кансерватыўнага дваранства. У. П. Мяшчэрскі.

П. Дз. Святаполк-Мірскі. Эпоха «давер'я». Указ 12 снежня 1904 г.

**IV.7. Знешняя палітыка Расіі ў пачатку ХХ ст.** Абвастрэнне міжнародных супярэчнасцей. Асноўныя накірункі знешняй палітыкі Расіі. Міністры замежных спраў: У. М. Ламздорф, А. П. Ізвольскі, С. Дз. Сазонаў.

Далёкі Усход у планах самадзяржаўя. Пабудова Кітайска-Усходняй чыгункі і арэнда Порт-Артура. Народныя паўстанні ў Кітаі і інтэрвенцыя вялікіх дзяржаў. Дыпламатычная ізаляцыя Расіі.

Расійска-японская вайна 1904—1905 гг. Ход ваенных дзеянняў на моры і на сушы. Бітвы пад Ляаянам і на р. Шахэ. Абарона Порт-Артура. Мукдэнская бітва. Цусіма. Портсмуцкі мір.

Абвастрэнне міжнародных супярэчнасцей. Англа-расійскае пагадненне і ўтварэнне Антанты. Баснійскі крызіс. Патсдамскае спатканне. Расія і Балканскія войны.

**IV.8. Грамадска-палітычная барацьба ў Расіі на рубяжы ХІХ—ХХ стст.** Стачачны рух 1895—1900 гг. Ліберальнае народніцтва. М. К. Міхайлоўскі. Легальны марксізм. «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». І з'езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). Эканамізм. Газета «Искра». ІІ з'езд РСДРП. Г. В. Пляханаў. У. І. Ленін, Л. Мартаў (Ю. В. Цедербаум).

Пралетарскі рух у пачатку ХХ ст. Абухаўская абарона. Стачка ў Растове-на-Доне. Усеагульная стачка на Поўдні Расіі ў 1903 г. Усеагульная стачка ў Баку ў 1904 г. Сялянскія хваляванні. Рух дэмакратычнай інтэлігенцыі і студэнцтва.

Стварэнне партыі эсэраў. В. М. Чарноў. Эсэраўскі тэрор.

Анархісцкія групы расійскай эміграцыі і іх сувязі з краінай. П. А. Крапоткін.

Земска-ліберальны рух. Гурток «Бяседа». Часопіс «Освобождение». П. Б. Струве. «Саюз земцаў-канстытуцыяналістаў». «Саюз вызвалення»

і афармленне «новага» лібералізму. Канферэнцыя рэвалюцыйных і апазіцыйных партый у Парыжы ў 1904 г. “Банкетная” кампанія.

**IV.9. Рэвалюцыя 1905—1907 гг. у Расіі.** Пачатак рэвалюцыі. Рэскрыпт на імя А. Р. Булыгіна. Буржуазна-апазіцыйны рух.

Развіццё рэвалюцыі вясной і летам 1905 г. III з’езд РСДРП і Жэнеўская канферэнцыя меншавікоў. Усерасійскі сялянскі саюз. Саветы рабочых дэпутатаў. Прафесіянальна-палітычныя саюзы і Саюз саюзаў.

Усерасійская Кастрычніцкая палітычная стачка. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Кабінет С. Ю. Вітэ і пытанні дзяржаўных пераўтварэнняў.

Утварэнне новых палітычных арганізацый і партый. «Саюз рускага народа» і Руская манархічная партыя. А. І. Дубровін, М. Я. Маркаў, У. М. Пурышкевіч. Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя. П. М. Мілюкоў. «Саюз 17 кастрычніка». А. І. Гучкоў.

Уздым сялянскага руху. Рэвалюцыйныя выступленні ў арміі і на флоце. П. П. Шмідт.

Снежаньскае ўзброенае паўстанне ў Маскве і ў іншых месцах імперыі. Адступленне рэвалюцыі.

Палажэнне 11 снежня 1905 г. аб выбарах у Дзяржаўную думу. Рэформа Дзяржаўнага савета. Новая рэдакцыя «Асноўных дзяржаўных законаў».

Арганізацыя з’ездаў аб’яднанага дваранства. А. А. Бобрынскі.

I Дзяржаўная дума, яе склад. С. А. Мурамцаў. Аграрнае пытанне. Дэкларацыя І. Л. Гарамыкіна. Роспуск Думы. «Выбаргскі заклік».

Кабінет П. А. Сталыпіна. Сістэма ваенна-палявых судоў. II Дзяржаўная дума, яе склад і дзейнасць. Ф. А. Галавін. Дзяржаўны пераварот 3 чэрвеня 1907 г.

**IV.10. Унутраная палітыка расійскага ўрада і грамадска-палітычны рух у 1907—1914 гг.** Трэцячэрвеньская палітычная сістэма. Выбарчы закон 3 чэрвеня 1907 г. III Дзяржаўная дума. М. А. Хамякоў, А. І. Гучкоў, М. У. Радзянка. Нацыянальная палітыка царызму. Справа Бейліса.

Сталыпінская аграрная рэформа. Указ 9 лістапада 1906 г. Перасяленчая палітыка. Увядзенне земстваў у заходніх губернях. Забойства П. А. Сталыпіна. Кабінет У. М. Какоўцава.

Грамадскае жыццё краіны ў 1907—1912 гг. Зборнік «Вехи». Справа Е. Ф. Азефа. Партыйна-палітычная барацьба. Партыя прагрэсістаў. А. І. Канавалаў, В. П. і П. П. Рабушынскія.

Новы ўздым агульнадэмакратычнага руху. Ленскі расстрэл. Выбары ў IV Дзяржаўную думу, яе дзейнасць. М. У. Радзянка. Рост стачачнай барацьбы. Легальныя рабочыя арганізацыі. Сялянскі рух. Выступленні ў арміі і на флоце.

Унутрыпалітычнае становішча Расіі напярэдадні Першай сусветнай вайны. Кабінет І. Л. Гарамыкіна. «Новы курс» эканамічнай палітыкі.

**IV.11. Удзел Расіі ў Першай сусветнай вайне.** Падрыхтоўка Расіі да вайны. Рэарганізацыя арміі. Ваенныя дамовы з Францыяй і Англіяй. Вялікая ваенная праграма 1913 г.

Пачатак Першай сусветнай вайны, яе характар. Уступленне Расіі ў вайну. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага. Вялікі князь Мікалай Мікалаевіч. Ход ваенных дзеянняў у 1914 г. Галіцыйская бітва. Ваенныя паражэнні ў 1915 г. Мікалай II — Вярхоўны галоўнакамандуючы. Ваенна-эканамічная мабілізацыя тыла. Ваенныя дзеянні ў 1916 г. Брусілаўскі прарыў. Роля Усходняга фронту ў зрыве германскіх планаў вайны.

**IV.12. Унутрыпалітычнае становішча Расіі ў 1914—1917 гг.** Маніфест 20 ліпеня 1914 г. «Свяшчэннае яднанне». Усерасійскі земскі саюз. Усерасійскі саюз гарадоў. Асобыя нарады. Ваенна-прамысловыя камітэты.

Вайна і расійскае грамадства. Узмацненне апазіцыйных настрояў у сувязі з ваеннымі няўдачамі. Утварэнне «Прагрэсіўнага блока». Распуціншчына. «Міністэрская чахарда».

Становішча народных мас. Рабочы і сялянскі рух. Хваляванні ў арміі. Паўстанне 1916 г. у Сярэдняй Азіі і Казахстане.

**IV.13. Украінскія землі ў складзе Расійскай імперыі у другой палове XIX — пачатку XX ст.** Адмена прыгоннага права на украінскіх землях і яе асаблівасці. Тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Транспарт. Гандаль. Сталыпінская аграрная рэыформа і яе вынікі на украінскіх землях.

Украіна ва ўмовах рэформ 1860—1870-х гг.

Грамадска-палітычнае жыццё Украіны. Украінскі нацыянальны рух. Украінафілы. Дзейнасць былых кірыла-мяфодзіеўцаў у Пецярбургу. “Украінская Грамада”. Часопіс «Основа». «Хлопаманы». У. Б. Антановіч. Кіеўская грамада ў 1860—1870-я гг. М. П. Драгаманаў. Дзейнасць Паўднёва-Заходняга аддзялення Расійскага геаграфічнага таварыства. Часопіс «Киевская старина».

Кампанія супраць украінафілаў у сувязі з паўстаннем у Польшчы. Цыркуляр П. А. Валуева 1863 г. Эмскі акт 1876 г. Паўстанне ў Польшчы і Правабярэжная Украіна.

Агульнарасійскі палітычны рух ва Украіне. Народніцтва. «Чыгірынская змова». Распаўсюджанне ідэй марксізму.

Украінскі нацыянальны рух у 1890-х гг. «Брацтва тарасаўцаў». Усеукраінская беспартыйная дэмакратычныя арганізацыя. Палітычныя арганізацыі і партыі ва Украіне. Рэвалюцыйная ўкраінская партыя. Украінская народная партыя. М. І. Міхноўскі. Украінская радыкальная партыя. Таварыства ўкраінскіх паступоўцаў.

Змякчэнне нацыянальнага прыгнёту і ўкраінскі рух. Агульнарасійскія партыі ва Украіне. Дзейнасць Украінскага сацыял-дэмакратычнага саюза («Спілкі»), Украінскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

Уздым грамадскага жыцця напярэдадні рэвалюцыі 1905—1907 гг. Украінская дэмакратычная партыя. Украінская радыкальна-дэмакратычная партыя. Таварыства ўкраінскіх паступоўцаў.

Масавы рух. Паўстанні сялян у Палтаўскай і Харкаўскай губернях у 1902 г. Падзеі рэвалюцыі 1905—1907 гг. на украінскіх землях. Украінская грамада ў Дзяржаўных думах.

Усходняя Украіна ў Першай сусветнай вайне. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі і ўкраінскія землі.

**IV.14. Заходнеўкраінскія землі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Адміністрацыйны статус Усходняй Галічыны, Паўночнай Букавіны і Закарпацця ў складзе Аўстра-Венгрыі. Аграрныя адносіны ў заходнеўкраінскай вёсцы. Стан прамысловасці і транспарту. Гарады і гандаль. Працоўная эміграцыя.

Русафільская («маскафільская») плыня ў грамадска-палітычным жыцці заходніх украінцаў. Газета «Слово». Руская Рада. Нарадоўцы. Гурток «Маладая Русь». Заснаванне і дзейнасць «Просвіты», навуковага таварыства імя Т. Р. Шаўчэнкі. М. С. Грушэўскі. Газета «Діло». Народная Рада.

Партыйна-палітычнае жыццё Усходняй Галічыны. Руска-украінская радыкальная партыя. І. Я. Франко. Украінская нацыянал-дэмакратычная партыя. «Новы курс» маладых русафілаў і ўтварэнне Рускай нацыянальнай партыі.

Узмацненне польска-украінскіх супярэчнасцей у Галічыне ў пачатку XX ст. Грамадска-палітычная сітуацыя ў Паўночнай Букавіне і Закарпацці. Украінскі нацыянальны рух ва ўмовах нарастання пагрозы Першай сусветнай вайны. Заходняя Украіна ў Першай сусветнай вайне.

**IV.15. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.** Абвастрэнне рэвалюцыйнага крызісу ў канцы 1916 — пачатку 1917 г. Забойства Р. Я. Распуціна. Паўстанне ў Петраградзе.

Царскі ўрад у першыя дні Лютаўскай рэвалюцыі. Стварэнне Часовага камітэта Дзяржаўнай думы. М. У. Радзянка. Адрачэнне Мікалая II і крушэнне манархіі. Петраградскі Савет і Загад № 1. Стварэнне Часовага ўрада. Г. Я. Львоў. Утварэнне дваеўладдзя.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Маскве, на фронце і ў правінцыі.

**IV.16. Культура Расіі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Грамадска-палітычныя ўмовы і асноўныя этапы развіцця культуры.

Асвета. Школа. Друк. Буйнейшыя кнігавыдавецтвы. І. Дз. Сыцін, А. С. Суворын, Ф. Ф. Паўленкаў. Культурна-асветныя ўстановы.

Навука і тэхніка. Развіццё новых напрамкаў у навуцы і станаўленне новых навуковых школ. Дасягненні ў галіне матэматыкі, астраноміі, фізікі, хіміі, медыцыны, біялогіі. П. А. Чэбышаў. С. В. Кавалеўская. А. Р. Сталетаў. П. Н. Лебедзеў. І. І. Мечнікаў. І. М. Сечанаў. І. П. Паўлаў.“Золотой век” рускай хіміі. Дз. І. Мендзялееў. А. М. Бутлераў. В. І. Вярнадскі. С. П. Боткін. В. М. Бехцяраў.

Геаграфічныя адкрыцці і дасягненні. П. П. Сямёнаў-Цян-Шанскі. М. М. Міклуха-Маклай. М. М. Пржавальскі. Вынаходства радыё. А. С. Папоў. Самалётабудаванне. А. Ф. Мажайскі. М. Я. Жукоўскі. Дзейнасць К. Э. Цыялкоўскага.

Філасофія і сацыялогія. Г. В. Пляханаў. У. С. Салаўёў. М. А. Бярдзяеў. С. М. Булгакаў. П. А. Фларэнскі. Гістарычная навука. С. М. Салаўёў. В. В. Ключэўскі. С. Ф. Платонаў.

Асноўныя напрамкі ў літаратуры Творчасць М. А. Някрасава, М. Е. Салтыкова-Шчадрына, І. С. Тургенева, Ф. М. Дастаеўскага, Л. М. Талстога, А. П. Чэхава, І. А. Буніна, А. М. Горкага, А. А. Блока.

Развіццё мастацтва. «Перасоўнікі». І. М. Крамскі. В. Р. Пяроў. В. В. Верашчагін. І. Я. Рэпін. Саюз рускіх мастакоў. Новыя напрамкі ў мастацтве: мадэрн, неарэалізм, абстракцыянізм. "Свет мастацтва". "Бубновы валет". Скульптура і архітэктура. М. М. Антакольскі. М. В. Мікешын. А. М. Апякушын. Узнікненне кінематографа. Я. А. Пратазанаў.

Тэатр. Творчасць М. С. Шчэпкіна, М. Н. Ярмолава, В. Ф. Камісаржэўская. Сцэнічнае мастацтва. К. С. Станіслаўскі і У. І. Неміровіч-Данчанка. Драматургія. А. М. Астроўскі.

Музычная культура. Рускае музычнае таварыства. А. Р. Рубінштэйн. «Магутная кучка». М. А. Балакіраў, Ц. А. Кюі, М. П. Мусаргскі, А. П. Барадзін, М. А. Рымскі-Корсакаў. У. В. Стасаў. Творчасць П. І. Чайкоўскага. А. М. Скрабін. Ф. І. Шаляпін. Л. В. Собінаў. А. В. Няжданава.

**IV.17. Украінская культура ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Агульная характарыстыка стану культуры. Развіццё ўкраінскага культурна-нацыянальнага руху.

Сістэма адукацыі. Украінскія ўніверсітэты. Станаўленне вышэйшай спецыяльнай адукацыі. Стварэнне вышэйшых жаночых навучальных устаноў. Дасягненні ў галіне матэматыкі (М. В. Астраградскі, Т. Ф. Асіпоўскі, Дз. А. Гравэ, У. А. Сцяклоў) , хіміі, фізікі (Б. П. Грабоўскі, І. П. Пулюй), медыцыны (Грамадства кіеўскіх врачоў), батаніцы (М. А. Максімовіч, М. Ф. Гамалей). Навуковае таварыства імя Т. Р. Шаўчэнкі. Гістарычныя даследаванні. В. Б. Антановіч. М. С. Грушэўскі. Дз. І. Багалей.

Умацаванне крытычнага рэалізму ў літаратуры. Марка Ваўчок (М. А. Вілінская), І. Я. Франко, П. А. Грабоўскі, М. М. Кацюбінскі, Леся Украінка, В. К. Віннічэнка, В. Кабылянскі. Тэатральнае мастацтва. І. П. Катлярэўскі. М. Л. Крапіўніцкі. Музычнае мастацтва. С. С. Гулак-Арцямоўскі, П. П. Сакальскі, Н. В. Лысенка. Жывапіс. С. І. Васількоўскі, К. А. Трутоўскі.

Культурныя сувязі з Беларуссю і Расіяй.

## *РАЗДЗЕЛ V.* РАСІЯ І ЎКРАІНА Ў 1917—1939 гг.

**V.1. Расстаноўка сацыяльных і палітычных сіл у Расіі і Украіне пасля Лютаўскай рэвалюцыі.** Стварэнне Часовага камітэта Дзяржаўнай Думы, Часовага ўрада, Петраградскага Савета. М. В. Радзянка, кн. Г. Я. Львоў, М. С. Чхеідзе. Узнікненне і сутнасць двоеўладдзя. Дэмакратызацыя дзяржаўнага строя, арміі, паліцыі, увядзенне палітычных свабод. Легалізацыя дзейнасці палітычных партый і нацыянальных арганізацый. Вяртанне палітычных эмігрантаў. У. І. Ленін. Пытанне аб

адносінах да вайны і першы (красавіцкі) крызіс Часовага ўрада. Стварэнне кааліцыйнага ўрада. Паглыбленне гаспадарчага крызісу і палітычнай анархіі. Першы Агульнарасійскі з’езд рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Дэманстрацыя 18 чэрвеня. Барацьба за ўладу на месцах.

Стварэнне Украінскай Цэнтральнай Рады (УЦР): сацыяльная база, склад удзельнікаў, праграма, дзяржавастваральная праца. Абвяшчэнне Украінскай Народнай Рэспублікі (УНР). Узаемадносіны УЦР і Часовага ўрада ў Расіі. Абвяшчэнне незалежнасці УНР. М. С. Грушэўскі. В. К. Вінічэнка.

**V.2. Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне у Петраградзе.** Ліпеньскі ўрадавы крызіс. Стварэнне другога кааліцыйнага ўрада. А. Ф. Керанскі. Барацьба ўрада з левымі радыкаламі. Канец двоеўладдзя. Нарастанне эканамічнага, палітычнага і нацыянальнага крызісу. Пагроза ўстанаўлення дыктатуры. Дзяржаўная нарада. Карнілаўшчына. Часовае аб’яднанне дзеянняў палітычных партый. Стварэнне Дырэкторыі. Узрастанне ўплыву бальшавікоў. Бальшавізацыя Саветаў. Л. Д. Троцкі. Абвяшчэнне Расіі рэспублікай. Дэмакратычная нарада, стварэнне передпарламента. Развал фронту. Анархічныя настроі ў грамадстве. Рэвалюцыйны экстрэмізм.

Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне ў Петраградзе. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК). М. І. Падвойскі. Сілы прыхільнікаў перавароту і Часовага ўрада. Ход паўстання. Другі Агульнарасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Фарміраванне Савета Народных Камісараў (СНК) і Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага камітэта (УЦВК). Л. Б. Каменеў. Першыя дэкрэты савецкай улады.

**V.3. Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні (кастрычнік 1917 г. — 1920 г.).** Устанаўленне ўлады саветаў на месцах. Рэвалюцыя ў нацыянальных раёнах і на франтах. Стварэнне антыбальшавіцкага цэнтра на Доне. Пераход улады да Саветаў у Маскве

Знішчэнне старога дзяржаўнага апарату. Стварэнне новых дзяржаўных структур. Блок бальшавікоў з левымі эсэрамі. Сацыяльныя пераўтварэнні. Увядзенне рабочага кантролю, экспрапрыяцыя буржуазіі. Усерасійская надзвычайная камісія (ВЧК). Ф. Э. Дзяржынскі. Падзел у вёсцы. Скліканне і роспуск Устаноўчага сходу. Я. М. Свярдлоў. Трэці Усерасійскі з’езд рабочых і салдацкіх дэпутатаў, яго аб’яднанне з трэцім з’ездам сялянскіх дэпутатаў. «Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа». Абвяшчэнне РСФСР. Ажыццяўленне права народаў на самавызначэнне. Барацьба бальшавікоў і Цэнтральнай Рады ва Украіне. Першы Украінскі з’езд Саветаў. Абвяшчэнне УССР.

